„Матура 2010” ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

На Грунвальд ☞ 5

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 23 (2821) Год LV | Беласток, 6 чэрвеня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Свята беларускай культуры

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У сонечную нядзелю 23 мая 2010 года сціхлі на пару гадзін шумлівыя фантаны ў беластоцкім парку каля палаца Браніцкіх, задуманым магнатамі як „англійскі”. Штодзень тут поўна наведвальнікаў, адпачываючых на лавачках паўз алеек, а адмысловыя фантаны святочнымі вечарамі гараць каляровым агнямі. На вялізнай сцэне, абслугоўваючай усе найбольшыя мерапрыемствы горада Беластока (у ім хочацца жыць больш чым, скажам, у Лондане, як вынікае з апытанняў!), улады якога так паўсюдна хваляцца шматкультурнасцю, паявіўся цвет выканаўцаў беларускіх імпрэз.

У гэты раз старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства не мусіў наракаць — на адну з найбольшых, відных імпрэз, арганізаваных ім, паявіліся сродкі. Таксама з міністэрства, якое апякуе нацменшасці ў Польшчы. А яно, па-паліцыйнаму пільнае, не толькі беларусам „дагадзіла” было ў свой час з-за дробнай, да таго паладжанай фінансавай правіны. Адцярпелі арганізатары тры гады з гаплікам, цудам утрымліваючы свае перадавыя мерапрыемствы, якіх чакаюць тысячы землякоў — удзельнікаў і атрымальнікаў. Перш за ўсё прыцягвае родная песня — нават тых, хто зусім ужо намінальна (або і не — пабачым у перапісе!) прылічвае сябе да беларусаў. Хутчэй многія з іх проста „тутэйшыя” ці агульна „праваслаўныя”. Але для ўсіх, хто сюды, у беластоцкі элегантны парк Плянты прыйшоў у гэтую нядзелю — гэта вялікае свята. Яны і апранутыя як на вяселле, урачыста і прыгожа, і дзеці ды ўнукі з імі.

Майстры мастацкага рукадзелля з Беласточчыны і Беларусі — не проста любіцелі. Ці ж скажаш пра вырабы ўмелых рук Ніны Цыванюк, вядомай спявачкі, аўтаркі вершаў і аніматаркі культуры з Гарадка (21 чэрвеня ў яе юбілей 80-годдзя!), што яна аматарка. Можам захапіцца яе вышыванкамі і карункамі, а побач вісіць камплектны беларускі строй, ёю поўнасцю выкананы. Побач — іншыя рукадзельніцы — з Гарадка, з Орлі. За доўгімі сталамі, дзе раскладаліся з кнігамі беларускія аўтары з Беласточчыны і спадар Ян Заброцкі з Варшавы з Цэнтра славянскай кнігі, размяшчаюцца яшчэ прылаўкі з вырабамі аўтараў з Гродзеншчыны: мастачак саломапляцення, карцін са скуры, жывапісцаў. Як штогод прысутнічаюць спадарыня Валянціна Брысач з жывапіснымі краявідамі і кветкамі ды Лідзія Шпектарава, сярод вырабаў якой найбольшай папулярнасцю карыстаюцца гліняныя звярочкі.

Мерапрыемства пачынае гімн беластоцкіх беларусаў — песня „Мой Беластоцкі край” на словы таксама сёлетняга юбіляра Алеся Барскага (Аляксандра Баршчэўскага; 2 лістапада ў яго таксама 80-годдзе) і словы старшыні БГКТ Янкі Сычэўскага, які вітае шматлікіх гасцей — дыпламатаў, святароў, улады Беластока і Гродзеншчыны, самаўрадаўцаў ды дэпутатаў, для якіх гэтае мерапрыемства з'яўляецца прадстаўнічым для беларускай культуры і вартым іхняе падтрымкі (таксама фінансавай) і прысутнасці на ім, таксама вельмі медыйнай і спрыяючай іх іміджу сярод беларускай грамады. Сярод такіх гасцей, між іншым, рэктар Вышэйшай менеджарскай школы Міхал Лісоўскі, родам з Зубава, які падтрымліваў агранізатараў беларускіх мерапрыемстваў у найгоршы час, калі не было ніякіх сродкаў на вядучыя і ўсе іншыя імпрэзы. У гэты раз хапае спонсараў, бо апрача ВМШ ёсць перш за ўсё МУСіА, горад, ваяводства і Культурны цэнтр Беларусі.

На свяце выступілі найлепшыя выканаўцы роднай песні — ад маленькіх дашкольнікаў з садка № 14 у Беластоку, праз вучняў пачатковых школ да пасівелых ужо ветэранаў беларускай эстрады і сцэны. Цяпер, калі амаль усе апранутыя ў новенькія беларускія строі (вялікае дзякуй Беларусі!), вельмі падобныя адзін на аднаго (толькі ляўкоўскія „Цаглінкі” верныя свайму вобліку) — з вялікім хваляваннем распазнаеш сярод радоў харыстаў і членаў калектываў светлыя твары, пазначаныя ўжо часам, такія вядомыя і блізкія сэрцу ўсім аматарам роднай культуры. З бельскіх „Васілёчкаў” і „Маланкі”, „Расспяванага Гарадка”, беластоцкай „Крыніцы”, гайнаўскага „Рэха пушчы”, козліцкай „Рэчанькі”, „Арлян”, „Чыжавян”... І маладыя, аптымістычныя — ад дашкольнікаў з „Вясёлкі”, моладзевых „Каласкоў”, бельскага „Вянка”, гайнаўскай „Знічкі”. Людзі чакаюць так народнай „Жэмэрвы” са Студзівод, гурту настаўніц з садка № 14, новых калектываў „Сугучча” з Крынак ці „Луны” з Парцава, як і эстрады, якая заўжды падымае на ногі беларускую грамаду — „Прымакоў” (Беласток), „Арт-Пронару” (Нарва), „Лайланда” (Беласток), „Калінкі” (Беласток). Слухачы вылучаюць твары і імёны салістаў, якія разам узрастаюць на нашых вачах: Дзям'яна Хаманюка, Андрэйкі Такаюка, Дамінікі Козлюк, Юлі Кузыкі (яшчэ пра іх пачуем!), Юліты Ваўрашук, Паўліны Нікалаюк, Дар'і Маркевіч, Марлены Беглюк. Усе будуць чакаць танцаў калектыву „Світанак” з бельскага комплексу беларускіх школ. Варта тут не забывацца пра тых, хто сваёй руплівай працай дакладаецца да відных вынікаў сваіх калег і вучняў: Анну Бабік, Генадзя Шэмета, Марту Грэдаль, Іаанну Хількевіч, Алу Каменскую, Міхася Аўхіменю, Бажэну Ляўчук, Марыю Якімюк, Мікалая Фадзіна, Лілію Жылінскую, Анну Вярцінскую, Яна Снарскага, Мікалая Мяжэннага, Віктара Маланчыка, Багдана Астапчука, Юрку Астапчука, Мар'юша Харужага, Сяргея Лукашука і Аліну Негярэвіч.

Свята беларускай культуры з'яўляецца першым з шэрагу сёлетніх беларускіх мерапрыемстваў, арганізаваных БГКТ. З ліпеня адбудзецца Купалле ў Белавежы. Беларускія калектывы выступяць на Музычных дыялогах над Бугам у Мельніку. Беларусы могуць спадзявацца беларускіх фэстаў у сваіх мясцовасцях, вельмі чакаючых роднай песні і свойскіх сустрэч. Такія мерапрыемствы ўдаюцца асабліва тады, калі спрыяюць іх арганізацыі і нават самі выходзяць з прапановамі павятовыя ці гмінныя ўлады. Там, дзе беларусы свядомыя і моцныя, не толькі да спевак, але і кіравання лёсам свае грамады — у Арлянскай, Чыжоўскай, Нараўчанскай гмінах...

Машына і бензін ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

У той час, калі афіцыйныя дзяржаўныя беларускія асобы, эканамісты, палітыкі і іншыя ўпаўнаважаныя чыноўнікі доўга і напружана тлумачылі свайму народу неабходнасць і непазбежнасць утварэння адзінай мытнай прасторы Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй і Казахстанам, простыя грамадзяне ламалі галаву над тым, як яны будуць жыць без машын...

ЗАПРАШЭННЕ

Аб'яднанне Бацькоў **АБ-БА** сардэчна запрашае на прэзентацыю артыстычнай творчасці дзяцей і моладзі, якая адбудзецца

11.06.2010 г. у 17.00 у ВААК („Сподкі”) па вул. св. Роха 14 у Беластоку

У праграме:

1. Спектаклі ў выкананні ўдзельнікаў тэатральнага гуртка „Гульня ў тэатр”:
— „Кастынг”,
— „Пампільё”,
— „Чырвоныя шапачкі”.

2. Прэзентацыя дыска „Васількі-валошкі” з песнямі на словы Віктара Шведа з удзелам дзіцячай групы Студыі беларускага фальклору.

3. Музычная праграма ў выкананні ўдзельнікаў праекта „Падляшскія хронікі”.

4. Развітанне з вучнямі, якія канчаюць пачатковую школу, гімназію і ліцэй.

5. Пачастунак і кірмаш

Малебен за дзяцей і моладзь, бацькоў і настаўнікаў адбудзецца **14.06.2010 у 18.00** у царкве св. Юр'я ў Беластоку.

9 770546 196000

Машына і бензін

У той час, калі афіцыйныя дзяржаўныя беларускія асобы, эканамісты, палітыкі і іншыя ўпаўнаважаныя чыноўнікі доўга і напружана тлумачылі свайму народу неабходнасць і непазбежнасць утварэння адзінай мытнай прасторы Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй і Казахстанам, простыя грамадзяне ламалі галаву над тым, як яны будуць жыць без машын, бо растаможка на самаходзікі павінна была стаць такой, як у Расіі, а гэта значыць, у некалькі разоў большай чым зараз. А гэта значыць, што сума заплачаных на мытні грошай будзе перавышаць кошт самага патрыманага аўтамабіля, купленага беларусам на Захадзе.

Кожны стаў выкручвацца па-свойму. Адны адразу кінуліся ў Еўропу купляць машыны, другія больш уважліва ставяцца да тых аўтамабіляў, якія маюць, каб яшчэ пахадзілі пару гадоў ці дзесяцігоддзяў. Знайшліся і такія, што вырашылі зарабіць на мытных зменах. Накуплялі яны машын, колькі грошай было, спадзеючыся, што пасля павелічэння кошту растаможкі аўтамабілі можна будзе прадаць даражэй. А яшчэ, паверыўшы агітатарам за адзіную мытную прастору, разлічвалі, што для іх адчыняцца расійскі і казахскі рынкі, тады заробак ад продажу машын будзе вельмі істотны.

Але Расія вырашыла, што ў яе і свайго транспарту хапае. І калі беларусы хочуць у адзінай мытнай прасторы прадаваць машыны, то павінны яшчэ раз заплаціць такую ж растаможку, толькі на гэты раз на расійскай мытні. Бедныя гандляры патрыманымі аўто ледзь не страцілі прытомнасці. І не столькі ад таго, што іх грошыкі прапалі, а больш ад абсурднасці і нелагічнасці ўспрымання расійскім бокам адзінай мытнай прасторы. Калі прастора адзіная, дык якія могуць быць мытныя пошліны ў яе сярэдзіне? Звычайнаму чалавеку гэта зразумець цяжка. А незвычайныя людзі нічога наконт такога падыходу патлумачыць не хочуць.

У гандляроў ужыванымі машынкамі застаўся толькі свой рынак, беларускі. А машын на яго нагналі столькі, што саліць можна. А тут яшчэ і спецыялісты з міністэрстваў, якія зусім нядаўна тлумачылі насельніцтву, якую карысць прынясуць новыя правілы, вырашылі растаможку пакуль не падымаць. І не таму, што пашкадавалі гэтых людцаў, каб аўто танней ім было, а таму, што рускія ў адзінай мытнай прасторы нафту беларусам прадаюць зусім не па адзіных коштах. Так што прасторы для думак і дзеянняў стала аж занадта. Гаворачы прасцейшай мовай, на адзіную мытную прастору няма адзінага погляду, меркавання і падыходу.

І як няшчасныя гандляры машынамі перасталі прывозіць свой тавар і ў роспачы ад таго, што няма куды дзець ужо набыты, пачалі толькі разводзіць рукамі, беларускія дзяржаўныя спецыялісты пачалі для іх машынак валачы нафту аж з Венесуэлы. Народу патлумачылі, што там нафта лепшая і таннейшая. Пасля першай партыі таннай венесуэльскай нафты, бензін у Беларусі істотна падаражаў. Зараз чакаецца другая партыя вельмі таннай нафты. Аўтамабілісты не выключаюць і наступнага падаражання бензіну. Калі нафта танная, то, па логіцы беларускіх спецыялістаў, бензін павінен быць дарагі. Напэўна гэта для раўнавагі і сіметрыі: танны — дарагі, як у гульні ў антонімы. Для простых людзей гэта зноў не зразумела. Няпростыя людзі простым нічога не тлумачаць.

Не дзіва, што Украіна, нават памяняўшы прэзідэнта на чалавека ледзь не з супрацьлеглымі ад папярэдніка поглядамі, у гэтую мытную прастору не лезе. А еўрапейцы жартуюць, што для поўнага камплекту ў гэтай прасторы Расіі, Беларусі і Казахстана, не хапае толькі Грэцыі з яе касмічнымі пазыкамі.

Здаецца, ужо нават і гэтая беларуская ўлада зразумела, якую карысць можна мець ад розных саюзаў з Расіяй. Правільна сцвярджае мудрасць, якая зараз хіба што адзіная, свабодна і без растаможкі гуляе па адзінай мытнай прасторы: „У Расіі жахлівае мінулае, страшная сучаснасць і вельмі вялікая будучыня. Так было і будзе заўсёды”.

А ў Беларусі на аўтарынках машыны сталі прадаваць танней, чым іх набылі на Захадзе. Так дыктуе ўнутраны рынак. А бензін — даражэй. Так дыктуе ўнутраная ўлада.

Віктар САЗОНАЎ

Камянецкі хор

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Размова з рэгентам Маладзёжнага хору пры Свята-Сімяонаўскай царкве ў Камянцы Брэсцкай вобласці, які на сёлетнім Фестывалі царкоўнай музыкі атрымаў вылучэнне ў катэгорыі прыхадскіх хароў, Аннай ГРУШЭЎСКАЙ.

— Якая моладзь спявае ў Вашым хоры?

— Гэтых дзяцей мы набралі з нядзельнай прыцаркоўнай школы. Мы іх набралі даўно, яны выраслі, сталі студэнтамі, але астаюцца спяваць у нас. А далей мы паціху набіраем маленькіх. Спяваюць школьнікі. Раней мы называлі сябе дзіцячым хорам, цяпер называемся маладзёжным хорам.

— Ці ў Камянцы ёсць іншае музычнае вучылішча апрача прыцаркоўнай школы?

— Ёсць Школа мастацтваў, усе нашы дзеці там вучацца музычнай грамаце.

— Ці Ваш хор спявае толькі ў час царкоўных богаслужэнняў ці дае таксама іншыя канцэрты?

— Даём. Мы выступаем з калядным канцэртамі ў школах, у горадзе. Таксам выступаем з велікоднымі канцэртамі. Часта ўдзельнічаем у фестывалях. Сёлета мы ездзілі ў Мінск на Міжнародны фестываль праваслаўных песнапенняў, дзе нашы дзеці занялі трэцяе месца.

— Ваш хор у Польшчы ўпершыню?

— Дзеці так.

— Камянецкі раён супрацоўнічае ў рамках г.зв. Еўрарэгіёна «Белавежская пушча» з нашым Гайнаўскім паветам...

— Справа ў тым, што ў мяне яшчэ ёсць вакальная група «Гармонія» з шасці жанчын, настаўніц музычнай школы і мы ўжо двойчы былі на Гайнаўшчыне. Былі мы на духоўным фестывалі ў Гайнаўцы ў 2006 годзе і ў 2008 годзе былі на фестывалі нацыянальных культур «Ператоча» ў Белавежы, які ладзіць Мікола Бушко.

— Далей у Польшчы Вы не бывалі?

— Не.

— А ў Беларусі? Вы сказалі што былі ў Мінску.

— Былі ў Мінску, Барысаве, у многіх мясцовасцях, так адразу цяжка ўсе назваць.

— Ці ў іншых гарадах Беларусі, раённых, ёсць ансамблі падобнага на Ваш рангу?

— Справа ў тым, што наш раён найменшы ў маштабе Беларусі. У нашым горадзе пражывае дзевяць тысяч насельніцтва. Іншыя раённыя цэнтры буйнейшыя і там хары мацнейшыя. У нас вельмі развіта музычная адукацыя. У нашым Камянецкім раёне працуе шэсць музычных школ, адна ў Камянцы і пяць у іншых мясцовасцях, і ў кожнай вучацца дзеці. У цэлым раёне дзеці маюць магчымасць вучыцца музыцы. Я ведаю, што ў Польшчы такіх школ мала.

— Ці ў Вашым хары спяваюць таксама дзеці з-па-за Камянца?

— Ёсць, яны прыязджаюць спяваць да нас, у нашым хоры.

— Вы сказалі, што ў Вашым хоры спяваюць студэнты...

— Адзін наш харыст вучыцца ў Брэсцкім музычным каледжы, іншыя вучацца ў політэхнічных вучылішчах, і іншых. Спектр іх адукацыі шырокі. Яны спявалі ў маленстве і калі прыязджаюць у Камянец, заўсёды спяваюць з намі. Ну, і, вядома, ездзяць з намі таксама на фестывалі.

— Вялікае Вам дзякуй. І — жадаю далейшых поспехаў.

Размаўляў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Пра Партнёрства пасля Сопату

Дзяржавы сённяшняй Еўропы не ў змозе функцыянаваць як аб’екты поўнасцю незалежныя і ізаляваныя. Як мне здаецца, інакш думае кіруючая Беларуссю палітычная эліта. Усё здаецца, што займаючыся гульнёй паміж Усходам (Расіяй) і Захадам (Еўрасаюзам) гэтая краіна імкнецца да гаспадарчай стабільнасці і паправы свайго эканамічнага статусу. Прытым не бярэцца за рашучыя рэформы ў гэтай сферы, пры захаванні палітычнага рэжыму далёкага ад дэмакратычных прынцыпаў, з ілюзорным — у рэальнай сферы дзеянняў — падзелам улады, прапанаваным Мантэск’ё, пры дзеяннях накіраваных на ўзмацненне ўлады Аляксандра Лукашэнкі.

Падумаў я сабе так, калі даходзілі да мяне ў апошні час інфармацыі з нефармальнай сустрэчы міністраў замежных спраў Еўрасаюза і міністраў членскіх краін польска-шведскай праграмы Усходняе партнёрства (Арменія, Азербайджан, Беларусь, Грузія, Малдова, Украіна). Пры нагодзе гэтага спаткання на старонках „Выбарчай газеты” паявілася кароткая размова з кіраўніком МЗС у Мінску Сяргеем Мартынавым (адказы былі дасланы ў рэдакцыю пісьмова). Спадар міністр пераконваў, успамінаючы пра УП:

— Беларусь з’яўляецца адным з найбольш энергічных прыхільнікаў праграмы. Мы ўключаемся ў праекты супрацоўніцтва. Перш за ўсё гаворка пра мадэрнізацыю пагранпераходаў, павелічэнне эфектыўнасці мытнай абслугі, інтэграцыю нацыянальных і рэгіянальных энергетычных сістэм, увядзенне новых тэхналогій аховы асяроддзя, маючых на мэце змаганне з ацяпленнем.

І зараз потым дадаў:

— Трывожаць нас таксама спробы дыскрымінацыі краін удзельнічаючых у праекце, асабліва Беларусі, шляхам выключэння нас з парламенцкага маштабу Партнёрства — асамблеі Еўранест. Гэта не можа намі адабрацца.

Міністр Мартынаў яшчэ раз адзначыў, што ўваход у ЕС пакуль не з’яўляецца для Беларусі мэтай і беларускія ўлады „выказваюцца за паступовае збліжэнне”, хоць беларуская эканоміка „больш чым адкрытая на ЕС”, высылаючы за мяжу 60 прац. свайго валавога прадукту.

У ранейшых выказваннях міністр не скрываў, што надалей галоўным і геаграфічна натуральным партнёрам Беларусі застаецца Расія.

Гэты чарговы сігнал, высланы міністрам Мартынавым, у гэты раз у „Выбарчай газеце” з нагоды сустрэчы ў Сопаце (прымала ў ім удзел м.інш. кіраўнік дыпламатыі ЕС Кэтрын Эштан) пацвярджае, што Беларусь трактуе УП як элемент гульні — як гэта назваў адзін з польскіх палітычных аналітыкаў — аварыйны выхад, фортку, якой можна было б пакарыстацца ў выпадку большай напругі з Масквой. Кіраўнік беларускага МЗС не хоча памятаць, што ў аснове УП ляжыць імкненне і дапамога не толькі ў эканамічным маштабе, але таксама, а можа і перш за ўсё, у дэмакратычных пераменах. Не памятае, што задзіночаная Еўропа надалей не адабрае беларускага парламента, вылучанага ў сфальшаваных выбарах, таму Беларусь не можа быць членам Еўранеста. Цяжка ў гэтым кантэксце не пагадзіцца з думкай міністра замежных спраў Польшчы Радаслава Сікорскага, які пры нагодзе сопацкага спаткання сказаў:

— Парламенты з’яўляюцца нашай найвышэйшай уладай, таму мы не будзем ім [Беларусі — М. Х.] навязваць сваёй волі. Мы нават рады былі б, калі б было парламенцкае супрацоўніцтва. Еўрапарламент растлумачыў, на якіх умовах згодны супрацоўнічаць з Беларуссю. Калі Беларусь з гэтым не пагаджаецца, мы не ў змозе нікога прымусіць.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Складанасці па беларускай мове

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У час матуральных выпрабаванняў, да якіх у маі прыступілі 140 сёлетніх выпускнікоў Бельскага белліцэя і 120 выпускнікоў Гайнаўскага белліцэя (некаторыя экзамены здавалі таксама выпускнікі з мінулых гадоў), новым быў абавязковы экзамен па матэматыцы і ўжо зараз некаторыя белліцэісты адкрыта заяўляюць, што не справіліся з ім, а паасобныя вучні апасаюцца, ці са станоўчым рэзультатам здадуць іншыя экзамены. Аднак ніякі іншы пісьмовы экзамен не выклікаў так масавых

Гайнаўскія белліцэісткі

эмоцый, як пісьмовы экзамен па беларускай мове, які адбыўся 21 мая і быў амаль канчатковым выпрабаваннем для нашых белліцэістаў. Выпускнікі белліцэяў, якія сталі лаўрэатамі і фіналістамі Алімпіяды беларускай мовы, рашыліся здаваць экзамен па беларускай мове з пашыраным узроўнем, бо ведалі, што пасля перамогі ў алімпіядзе без пісання работ атрымаюць максімальную колькасць балаў. Усе іншыя белліцэісты прыступілі да экзамену па беларускай мове з падставовым узроўнем, але нечакана пачалі моцна наракаць на цяжкі для іх публіцыстычны тэкст, на падставе якога трэба было ім выконваць заданні, якія правяралі зразуменне прачытаных фрагментаў.

— Большасць нашых вучняў, прыступіўшы да матуральнага экзамену па беларускай мове, былі ў шоку. Мы пад вялікім уражаннем, бо не разлічвалі, што ажно такі цяжкі будзе экзамен па роднай мове, — заявіла пасля пісьмовых выпрабаванняў Ева Кудэрская з Бельскага белліцэя. — Публіцыстычны тэкст быў незразумелым і я, прачытаўшы яго, была прыгнечана. Па 3-4 разы я чытала паасобныя абзацы і каля дзвюх гадзін затраціла адказваючы на заданні да тэксту, а пры гэтым перапісвала фрагменты з яго, бо не ведала як сваімі словамі пераказаць змест.

Вучням трэба было прачытаць тэкст Валянціна Акудовіча „Уводзіны ў новую літаратурную сітуацыю" і паводле яго сваімі словамі адказаць на пытанні. Менавіта тэкст пра беларускую літаратуру пачатку XX стагоддзя і пазнейшых перыядаў выклікаў ажно столькі эмоцый.

— Ніхто з нас не спадзяваўся, што такім цяжкім будзе публіцыстычны тэкст. Я заўважыла, што, прыступіўшы да экзамену, можа праз дваццаць хвілін ніхто вакол мяне не пачынаў даваць адказаў да задач, толькі ўсе чыталі і стараліся зразумець паасобныя фрагменты публіцыстычнага тэксту. Мы не маглі знайсці часткі адказаў на патрабаванні ў задачах, а столькі ж гадоў на матуральных экзаменах публіцыстычныя тэксты былі простымі для аналізу і мы не ведаем, чаму ў гэтым годзе такія складаныя далі, — сказала Анна Варанецкая з Гайнаўскага белліцэя.

Яе сябра Адам Васілюк пацвердзіў, што ў гэтым годзе тэкст для аналізу быў намнога больш складаным ад тых з папярэдніх гадоў, якія разглядаліся белліцэістамі на ўроках беларускай мовы.

— Вельмі цяжка было справіцца з пытаннямі да публіцыстычнага тэксту, у якім было многа вытанчаных і цяжкіх для зразумення слоў. Калі я не ведала, як сваімі словамі адказаць на патрабаванні заданняў, дык перапісвала сказы з тэксту, каб хаця нешта было ў адказах, — гаварыла Юстына Пагрэбнік з Бельскага белліцэя. — Пасля аказалася, што не толькі я, але большасць нашых вучняў не разумела гэтага публіцыстычнага тэксту, а некаторыя не разумелі нават патрабаванняў у задачах. Ведаю, што некаторыя асобы ўвогуле не адказвалі на некаторыя пытанні, каб больш часу мець на пісанне творчых работ.

Бельскія белліцэісты

Такі падыход можа апраўдацца, паколькі за заданні да публіцыстычнага тэксту можна было максімальна атрымаць толькі 21 бал, а за творчую працу ажно 49 балаў. Каб паспяхова справіцца з пісьмовым матуральным экзаменам па беларускай мове, трэба было набраць толькі 21 бал і я думаю, што ўсе выпускнікі белліцэяў павінны прынамсі столькі ж іх набраць. Застаецца спадзявацца, што ў будучыні не будзе ўжо матуральных тэкстаў, з-за якіх вучні столькі б нерваваліся.

— Хаця значэнне некаторых слоў было растлумачанае, цяжкімі былі і іншыя словы ў крытычна-літаратурным тэксце, які трэба было прылічыць да катэгорыі эсэ. Гэта быў самы цяжкі для зразумення публіцыстычны тэкст, які паявіўся на матуральным экзамене па беларускай мове пасля яго рэфармавання, — заявіў настаўнік беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі. — На экзамене па польскай мове тэкст быў зразумелым і пры гэтым закранаў праблемы, якімі цікавяцца вучні, бо тычыўся інтэрнэту.

У другой частцы пісьмовага экзамену па беларускай мове з падставовым узроўнем трэба было выбраць верш або фрагмент прозы і на падставе іх напісаць сачыненне. Тэма першая: „Беларускі менталітэт на аснове аналізу і інтэрпрэтацыі верша Уладзіміра Караткевіча „На Беларусі Бог жыве". Звярні ўвагу на мастацкія спосабы яго паказання ў творы".

— Калі я закончыла пісаць адказы да публіцыстычнага тэксту, заставалася мне ўжо няцэлая гадзіна, каб напісаць творчую працу і я не рашылася пісаць яе на падставе прозы, бо не хапала часу, каб учытвацца ў яе, толькі рашылася пісаць работу на падставе верша. Гледзячы з другога боку, то я люблю аналізаваць вершы і гэтая тэма мне падыходзіла, — тлумачыла Ева Кудэрская.

— Я таксама пісала сачыненне на падставе верша, які мы якраз аналізавалі на ўроку беларускай мовы і я памятала нават мастацкія прыёмы ў гэтым творы, — гаварыла Юстына Пагрэбнік.

Аднак усё ж такі рэдкасцю было, калі белліцэісты з Бельска ці Гайнаўкі рашаліся пісаць сачыненні на аснове верша Уладзіміра Караткевіча. Найчасцей вучні пісалі творчыя работы на другую тэму: „На аснове аналізу фрагментаў рамана Івана Мележа „Людзі на балоце" напішы, чым для простага чалавека з'яўляецца свабода".

— Я рашылася пісаць працу, спасылаючыся на фрагмент рамана „Людзі на балоце". Я памятала як мы аналізавалі гэты твор у школе і ён мне да спадобы, — заявіла Анна Варанецкая.

Гонка за індэксамі

Пасля размоў з белліцэістамі і іх настаўнікамі было відаць, што большасць вучняў вельмі сур'ёзна ставіцца да матуральных экзаменаў, якія ад апошняй іх рэформы пераўтварыліся ў гонку за індэксамі вышэйшых навучальных устаноў. Выпускнікі белліцэяў, як і іншых школ, ужо загадзя стараліся выбраць спецыяльнасці для далейшай вучобы і згодна з патрабаваннямі прыёму ў ВНУ запісваліся здаваць экзамены ў пашыранай формуле якраз па тых прадметах, якія пасля павінны стаць пропускам у вышэйшыя ўстановы. Новым і невядомым у гэтым годзе быў абавязковы матуральны экзамен па матэматыцы, чаго не было ўжо 25 гадоў у класах з гуманітарным ухілам і некаторыя белліцэісты ўжо зараз лічаць, што з гэтым экзаменам не справіліся, бо спачатку сістэматычна не вучыліся матэматыцы, а пасля не былі ў змозе папоўніць свае веды і ўмеласці. Калі б іх разважанні пацвердзіліся, гэты нездадзены экзамен можа стаць перашкодай пры паступленні ў ВНУ.

— У гэтым годзе задачы па матэматыцы не былі складанымі, але такімі, каб кожны вучань, які патрапіць лагічна думаць, мог набраць прынамсі 30% магчымых да здабыцця балаў і здаць экзамен па матэматыцы. Аднак ёсць вучні, які прыходзілі да нас на вучобу з вялікімі недахопамі матэматычных ведаў і таму цяжка было ім справіцца з рэалізаваным у ліцэі матэрыялам. Ужо ў канцы чэрвеня будзе вядома як атрымаўся экзамен па матэматыцы, бо тыя падлікі, што вучні робяць самі, не спраўджаюцца, — сказала настаўніца матэматыкі Гайнаўскага белліцэя і заадно намеснік дырэктара Ніна Лукасік.

— Зараз паміж самымі лепшымі вучнямі ідзе гонка за індэксы самых прэстыжных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў і таму цяжка разлічваць, каб на пісьмовым экзамене па матэматыцы ці іншых прадметах адны вучні пісалі шпаргалкі другім, бо для гэтага ўвогуле няма часу, — лічыць дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк.

Супярэчлівыя выказванні наконт прэзентацый

Хаця некаторыя белліцэісты рашаюцца працягваць адукацыю на беларускай філалогіі, то наогул такіх асоб мала. Рэдка таксама вынікі з пісьмовага матуральнага экзамену па беларускай мове лічацца на вышэйшых установах вынікамі па замежнай мове, але я не спаткаўся з выпадкам, каб нашы белліцэісты наракалі, што экзамены па беларускай мове ў пісьмовым варыянце непатрэбныя або ім замінаюць. Затое мае суразмоўцы ўжо па-рознаму выказваліся наконт прэзентацый па беларускай мове.

— Дзевяць гадоў вучыліся мы па нашай роднай мове і я лічу добрым гэта завяршыць прэзентацыяй, — сказала Катажына Філіманюк з Бельскага белліцэя, якая ў час размовы ўспамінала сваё выступленне перад экзаменацыйнай камісіяй.

У падобным тоне выказваліся таксама многія іншыя суразмоўцы. Вучні наогул рыхтавалі прэзентацыі паводле класічнай і сучаснай беларускай літаратуры, ахвотна расказвалі пра абрады і асаблівасці іншых фальклорных праяваў. Белліцэісты выступалі з аповедамі пра свае мясцовасці, сем'і, а таксама пра Супрасльскі манастыр ці ікону Дзмітрыя Салунскага. Відаць было, што падрыхтоўка такіх прэзентацый не была асабліва складанай. Аднак сярод вучняў паяўляюцца таксама выказванні аб немэтазгоднасці прэзентацый па беларускай і польскай мовах, бо рыхтуючыся да іх трэба траціць час, які можна было б выкарыстаць на падрыхтоўку да пісьмовых экзаменаў.

— Вынікаў прэзентацый па беларускай і польскай мовах і з вусных экзаменаў па замежных мовах не патрабуюць хіба на ніякіх спецыяльнасцях у вышэйшых установах, — заявіў дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк.

Белліцэісты спадзяюцца, што станоўча справіліся з матуральнымі экзаменамі, аднак ведаюць, што ад колькасці балаў, якія здабудуць па паасобных прадметах, будзе залежаць ці паступяць на выбраныя спецыяльнасці вышэйшых навучальных устаноў.

Старое Ляўкова

Захаваем сваю тоеснасць

У Старым Ляўкове Гайнаўскага павета заснавалі Клуб маладых рэгіяналістаў, які рэалізаваў праект „Захоўваем тоеснасць".

Пасля поўдня 21 мая г.г. у стараляўкоўскай святліцы рэгіяналісты прадэманстравалі зняты моладдзю кінафільм „Вяселле, хрэсьбіны і пахаванні". У ім выступілі а. Леанід Янкоўскі, Вольга Адамюк, Вера Осяк, Марыя Русіновіч, Юрка Рубчэўскі, Міхал Харкевіч, Вера Субота і Вера Карпюк.

Затым запрошаныя госці, у тым ліку старшыня Гміннай рады ў Нараўцы Андрэй Недзведзь, старшыня Грамадскай і сацыяльнай камісіі Гміннай рады Ян Целушэцкі, настаяцель Ляўкоўскага прыхода а. Леанід Янкоўскі ды мясцовыя жыхары агледзелі фотавыстаўку пра абрады ды выставу гафтаў і карунак. Раман Казлоўскі падрыхтаваў карту Ляўкова і аколіц з колішнімі назвамі пасяленняў і ўрочышч, як напрыклад, Галубы (сёння Падляўкова), Беглюкі (зараз Мінкоўка), Дзедзічы (Сушчы Барок), Казінэ, Хмельнікі, Красная грэбля.

Усіх сабраных пачаставалі пірожным дамашняй выпечкі. На заканчэнне імпрэзы з канцэртам выступіў маладзёжны музычны калектыў са Старога Ляўкова. Ён спяваў і іграў беларускія мелодыі.

Мерапрыемства пад загалоўкам „Захоўваем тоеснасць" падрыхтавала Галена-Марыёля Рэент, кіраўнічка святліцы. **(яц)**

Страчаныя дакументы

Саюз польскіх банкаў пры падтрымцы паліцыі пачаў папераджальную акцыю аб магчымасці фіксавання страчаных (украдзеных або згубленых) дакументаў у банку. Дагэтуль у такіх справах пацярпелыя звярталіся ў паліцыю. Зараз можна гэта зрабіць у банку. І кожны мае такую магчымасць, нягледзячы на тое, ці з'яўляецца ён уладальнікам банкаўскага рахунка ці не. Штораз больш банкаў прымае заявы аб страце дакументаў нават ад тых, хто не карыстаецца іхнімі паслугамі. Абазначае гэта, што наведанне банка лічыцца самым пэўным спосабам, каб забяспечыцца ад непрыемных паслядоўнасцей у выніку страты дакументаў.

Статыстыка паказвае, што кожны дзень здараюцца некалькі дзесяткаў спроб пакарыстацца чужымі дакументамі для вымантачання пазыкі, пракату аўтамабіля з мэтай яго крадзяжу, ці іншых махлярстваў. Разумеецца, што віноўнікам будзе той, чыімі дакументамі пакарыстаецца ашуканец. Важнейшымі дакументамі лічацца агульны і замежны пашпарты, вадзіцельскія правы, ваенны білет, рэгістрацыйныя дакументы машыны, крэдытная карта і карта пастаяннага жыхарства. **(ус)**

Спачуванні

23.05.2010 г. памёр
Яўген РАМАНЧУК

тата Касі, цесць Адама, дзядуля Нікі і Віктара.

Шчыра Вам спачуваем
— сябры з Аб'яднання АБ-БА

Размова з **Пятром Сэльвесюком**, *войтам Арлянскай гміны.*

Пабудова каналізацыі пры вуліцы Пясковай у Орлі

— Гледзячы сёння на Орлю можна сказаць, што яна з'яўляецца нейкай будаўнічай пляцоўкай, з самай вясны.

— Трэба перш за ўсё адзначыць, што такога, як сёлетні, 2010 год, дагэтуль у Орлі не было, бо пры ўласным бюджэце парадку васьмі мільёнаў на агульныя інвестыцыі, у гміне расходуем амаль пяць мільёнаў злотаў, а з таго тры з паловай выдаткуем у самой Орлі. Калі было аналізаванае дваццацігоддзе мясцовага самакіравання, мы канстатавалі, што ніводнага года не прызначалася столькі сродкаў на інвестыцыі ў самой Орлі. І я не гавару пра квоты, толькі пра рэлятыўныя выдаткі, з якіх амаль палова прызначаецца на самую Орлю.

— А што Вы можаце сказаць пра параўнанне выдаткаў нашай гміны на інфраструктуру з іншымі гмінамі?

— Усе гміны праводзяць нейкія інвестыцыі, аднак складана мне гаварыць пра іх. Мяркую, што нашы інвестыцыйныя паказчыкі будуць найлепшымі ў ваяводстве.

— Вялікія грошы прызначаюцца на каналізацыю, аднак яе не надта відаць.

— Яна не кідаецца ў вочы, але цяжка ўявіць сабе сучасную мясцовасць — калі нават яна старэе — без каналізацыі. Калі хочам каб Орля развівалася, дык каналізацыя з'яўляецца для гэтага асновай. І няма сэнсу класці новае вулічнае палатно, тратуары ці газоны, калі спярша не пойдзе пракладка каналізацыі, бо праз два-тры гады можа аказацца, што тое новае палатно трэба пад каналізацыю пароць.

— А можа ў будучыні вернемся да гарадскіх правоў, якімі Орля карысталася амаль трыста гадоў? Хаця ў Орлі штораз менш жыхароў — толькі 907 асоб (стан на дзень 12.05.2010 г.), а, для параўнання, у 1988 годзе было каля дзвюх тысяч.

— На сённяшні дзень жыхароў штораз менш, аднак думаю, што пабудова фабрыкі фірмы ІКЕА дасць Арлянскай гміне жыццядайны штуршок. Заўчасна спадзявацца, што ўжо сёлета ці ў наступным годзе Орля дыяметральна зменіцца. Але змены ўжо відаць: можна з'ездзіць на інвестыцыйны абшар, дзе яшчэ нядаўна было чыстае поле, а цяпер там дзейнічаюць фірмы з нашага рэгіёна. І гэта паступова будзе набіраць размах.

Адносна статыстык трэба быць памяркоўным. Не толькі наша гміна старэе, аднак лічу, што фабрыка дасць станоўчы штуршок і ў гэтым аспекце. Старыя людзі паміраюць, а маладыя выязджаюць туды, дзе ёсць праца. Калі тут будзе праца, то частка людзей астанецца напэўна тут і будзе дадатны натуральны прырост.

— Трэці этап пракладкі каналізацыі ў Орлі рушыў з абодвух канцоў мястэчка...

— Так, ад вуліцы Міцкевіча ды вуліц Пясковай і Партызанаў. Таму той кусок, бо тамашнія жыхары хочуць мець асфальт, якога там дагэтуль не было; пакладзем яго ў наступным годзе. Апрача згаданых вуліц ідзе другі этап пракладкі па вуліцах Чырвонай Арміі (вуліца доўгая, трохкіламетровая), Аградовай, Вызвалення, Спулдзельчай ды першы этап па вуліцах Першамайскай, Кляшчэлеўскай ды вулічках, якія злучаюць Пясковую і Партызанаў. Тэрмін выканання той інвестыцыі прадбачаны на сёлетні жнівень. Увесь кошт інвестыцыі, ужо пасля таргоў, гэта 2 млн. 743 тысячы злотаў, з чаго атрымаем 1 млн. 786 тысяч дафінансавання, г.зн. 75% кваліфікаваных коштаў.

Апрача гэтага завершаны ўжо таргі на пракладку новага асфальтавага палатна, выкананне пад'ездаў і тратуараў на дзвюх вуліцах: Сянкевіча і часткова Чырвонай Арміі. І на гэта атрымалі дафінансаванне ў 326 тысяч злотаў з Праграмы перабудовы мясцовых дарог, г.зн. палову вартасці ўсёй інвестыцыі ў 652 тысячы злотаў.

Чарговай арлянскай інвестыцыяй будзе добраўпарадкаванне цэнтра Орлі, значыць, абнаўленне адпачынковага парку. На гэтую мэту маем адведзеныя ў бюджэце 120 тысяч злотаў, рыхтуем дакументацыю для дафінансавання. Таксама сёлета хочам выканаць праектную дакументацыю на пабудову Гміннага асяродка культуры; на гэтую мэту прадбачылі мы 30 тысяч злотаў. Гэты аб'ект мае паўстаць побач Кааператыўнага банка, на ўчастку плошчаю ў тысячу квадратных метраў.

— Ці ў справе парку ўзніклі нейкія ўскладненні?

— Ёсць праблема з атрыманнем згоды захавальніка помнікаў даўніны, бо парк занесены ў іх спісак. Захавальнік запатрабаваў на першым этапе (трэба прыгадаць, што калісь на месцы парку быў рынак) зрабіць з парку рынак шляхам высечкі часткі дрэў і пад'ёму ўзроўню грунту ды прыбранне ўсіх паветраных электраліній (на абочыне парку стаіць трансфарматар — М. М.). На сённяшні дзень гэта — на мой погляд — даволі дзіўнае рашэнне, бо быў такі час, яшчэ пакуль я стаў войтам, што ў парку трава была па калені і адсюль збіралі сена. Парк зараз дагледжаны, але патрабуе абнаўлення, і здзіўляе мяне стаўленне захавальніка, які не згаджаецца на выкананне новых тратуараў, лавак ці асвятлення, адно хоча, каб сярэдзіна была пустая, а дрэвы былі толькі на акраіне. Пакуль я буду войтам, не дазволю высечкі дрэў, тым больш, што на вуліцы Канапніцкай, дзе некалькі дрэў папросту нішчыць каранямі асфальт, я звярнуўся да захавальніка за згодай на высечку іх, а ён не згадзіўся і напісаў, што «nie ma potrzeb ani możliwości w takich strefach konserwatorskich wycinać drzew», а тут бачу іншае стаўленне. Аднак працуем над гэтай справай і думаю што неўзабаве закрыем гэтую тэму. А справа цягнецца ўжо некалькі месяцаў ды дзяржава не павінна «шкодзіць», толькі «дапамагаць».

— Спытаю пра сінагогу: ці будзе яна мець свайго ўладальніка? Жыды не хочуць?..

— Уладальнікам з'яўляецца казна, якую рэпрэзентуе бельскі староста, а ключ маем мы. Вядома, на свой лад дбаем пра гэтую сінагогу, абкошваем пляц. І тут наступная праблема, бо цягнецца, бадай ужо восем гадоў, рэгуляцыйны працэс. А мы давялі да таго, што жыдоўская гміна згадзілася на падзел участка, бо на вымашчаным брускамі пляцы перад сінагогай стаіць будынак цяперашняга Гміннага асяродка культуры. Гэта ўсё знаходзіцца на адным участку і жыдоўская гміна хацела, каб усё гэта прызначыць ім. Аднак я з гэтым не згаджаўся і пасля двух ці трох гадоў яўрэйская гміна згадзілася і падзел ужо зацверджаны. Цяпер жыдоўская гміна атрымае будынак сінагогі і частку абгароджанага ўчастка вакол яе. Я хацеў бы, каб у сінагозе зрабіць рамонт, аднак жыдоўская гміна адказвае, што пакуль не мае грошай. Пажывём — пабачым.

— А што сёлета плануеце зрабіць па-за Орляй?

— Завершаны рамонт святліцы ў Шарнях, зараз ідзе рамонт у Міклашах — там вылілі падлогу і будзе новы памост ды новыя вокны. У Спічках таксама памяняем вокны, закончылі маляванне інтэр'ера ў Дыдулях. Аб'яўлены таргі на завяршэнне пабудовы святліцы ў Вульцы-Выгаоўскай ды на капітальны рамонт святліцы ў Малінніках.

— А што з будынкам былой школы ў Шчытах?

— Там таксама працуюць. Звяз беларускай моладзі атрымаў дафінансаванне ў 360 тысяч злотаў і шукалі ўласнага ўзносу ды назбіралі 10 тысяч, а ІКЕА дадала 30 тысяч.

Апрача святліц робім таксама дарогі. Будзе выканана дарога з Дыдулёў у Круглае, па якой ездзіць гмінны аўтобус, а павет за ўласныя сродкі выканае асфальтападобную маставую з Парцава ў Спічкі.

— Дзякую за размову.

*Размова з **Анатолем Вапам**, дырэктарам дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства*

Фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Вялікая канцэнтрацыя ў Беластоку

„Ніва": — *Кім быў, па-вашаму, дырэктара дэпартамента культуры і гісторыка па адукацыі, вялікі князь Вітаўт Ягайла, як цяпер акрэсліваецца — архітэктар перамогі пад Грунвальдам: ліцвіном, беларусам, палякам?*

Анатоль Вап: — Несумненна, ліцвіном, паходзіў з літоўскай дынастыі. Тут няма сумненняў. Затое мова, якою карыстаўся, была беларуская, старажытнабеларуская. Гэта была дзяржаўная мова Вялікага Княства Літоўскага.

— ***Чаму якраз у Беластоку 10 і 11 ліпеня адбудзецца рэканструкцыя канцэнтрацыі войскаў Вялікага Княства Літоўскага, увекавечваючая падзеі шасцісотгадовай даўнасці, завершаныя бітвай пад Грунвальдам?***

— У чэрвені 1410 г. на гэтай тэрыторыі сканцэнтраваліся канчаткова войскі Вялікага Княства Літоўскага, дакладна: на поўдзень ад ракі Нарвы ў раёне Бельска. Адтуль рушылі на Грунвальд. Можаце спытацца, чаму якраз у Беластоку, а не ў Бельску? Беластока ў той час проста не было. Тут, дзе распаложаны цяпер Беласток, праўдападобна стаяла тады некалькі хат. Беласток сёння распаложаны на гістарычнай Бельскай зямлі. Другой падзеяй, якая вырашыла аб святкаванні юбілею Грунвальдскай бітвы тут, а дакладней аб адзначанні канцэнтрацыі войск ВКЛ, з'яўляецца спасылка на наезд вясной 1410 г. вялікага маршала крыжацкага ордэна Фрыдрыха фон Валенрода на Берасце, дзе праводзілася нарада датычная працягваючайся вялікай вайны з ордэнам. Удзельнічаў у ёй таксама князь Вітаўт і праўдападобна мэтай маршала Валенрода было спаймаць князя.

— ***А ў раёне якіх сённяшніх падбельскіх мясцовасцей дайшло да канцэнтрацыі?***

— Цяжка сёння сказаць. Гэта даследчыцкае пытанне. Невядома, якія мясцовасці тады напэўна існавалі. Несумненна, лагістычным забеспячэннем гэтай канцэнтрацыі быў сам Бельск з драўляным замкам.

— ***Як будзе адзначацца канцэнтрацыя войск ВКЛ?***

— Урачыстасці пачнуцца ў суботу 10 ліпеня, хоць ужо дзень раней з'едуцца рыцары з большасці зямель ВКЛ. Будзе таксама мазавецкая харугва з трыццаці збройных вояў. 9 ліпеня ўзнікне абоз Вялікага Княства на тэрыторыі Музея вёскі за Беластокам. Можна будзе яго паглядзець 11 ліпеня. 10 ліпеня каля поўдня адбудзецца падрыхтоўка да бітвы, будзе праведзена стыча — рэканструкцыя бітвы з часу вялікай вайны з Крыжацкім ордэнам. Каля 18 гадзіны праз Гарадскі пляц пяройдуць войскі і пачнецца тут канцэрт даўняй музыкі. Будуць таксама м.інш. паказы фокуснікаў, змаганняў з удзелам 40-50 рыцараў. Гэты дзень завершыцца канцэртам гуртоў з Польшчы і Літвы, а пасля выступяць гурт „Стары Ольса" з Беларусі і тэатр вандроўнага танца „Яварына" з паказам фры-шоў. 11 ліпеня ў Беластоцкім музеі вёскі адбудзецца рэканструкцыя — штурм берасцейскага града ды м.інш. турніры па стралянні з лука, рыцарскія, дворскія і плебейскія забавы, канцэрты калектываў з Польшчы, Літвы і Беларусі, паказы ружжа, а таксама майстар-класы па лучніцтве, сярэднявечным танцы, штукарстве і даўніх рамёствах. Назаўтра беластоцкія госці пададуцца на цэнтральныя ўрачыстасці пад Грунвальд.

— ***Колькі асоб будзе ўдзельнічаць у беластоцкай рэканструкцыі?***

— З Літвы прыедзе каля сотні ўдзельнікаў, між іншым, прынамсі трыццаць збройных. Апошнія гэта члены ансамбля даўняй музыкі і рамеснікі, што займаюцца сярэднявечным рамяством. З Беларусі прыедзе амаль 190 збройных рыцараў, між іншым, згуртаваных у рэспубліканскім маладзёжным аб'яднанні „Рыцары Вялікага Княства", на чале якога стаіць маршал Фёдар Міхеў. З Беларусі прыбудуць рыцары, лучнікі, а таксама артылерысты з двумя ці трымя сярэднявечнымі гарматамі. Паколькі беларуская група будзе найбольш шматлікай, гэта яна піша сцэнарый рэканструкцыі, які пасля будзе кансультаваны з палякамі і літоўцамі. Прыедзе таксама каля дзесяці вояў з Расіі. Актыўны ўдзел у арганізацыі святкаванняў прымае Культурны цэнтр Беларусі з сядзібай у Беластоку — арганізацыйны, але і фінансавы.

— ***А якія планаваныя кошты гэтага мерапрыемства?***

— Прымем агулам каля 350 удзельнікаў. Таму і кошт — значны. Гэта больш за 300 тысяч злотых.

— ***У лісце-запытанні ў справе супольнай арганізацыі святкаванняў 600-годдзя бітвы пад Грунвальдам віцэ-міністр культуры Польшчы і віцэ-міністр абароны Літвы напісалі, што яны зацікаўлены супрацоўніцтвам пры рэалізацыі навукова-даследчыцкіх праектаў звязаных са святкаваннем гадавіны. Ці ў нашым рэгіёне прадбачана рэалізацыя такога праекта?***

— Першапачаткова мы планавалі ўвайсці ў навукова-даследчыцкую сферу ў значны спосаб. Меў быць падрыхтаваны цыкл дакладаў, званых „грунвальдскімі дакладамі" з удзелам гісторыкаў з Літвы, Польшчы і Беларусі, а таксама з Берліна. Мела гэта фінансавацца са сродкаў Нацыянальнага цэнтра культуры. На жаль, прапанавана была на гэтую мэту вельмі малая сума — 20 тысяч злотых. Таму няма магчымасці арганізаваць гэтыя даклады. Затое з нагоды канцэнтрацыі заказалі мы ў буклет папулярнанавуковы тэкст у гісторыка Алега Латышонка. Будзе ў ім шмат цікавых інфармацый, якіх няма ў агульнай свядомасці.

— ***Які сэнс гэтага мерапрыемства, які мае быць яго грамадскі пераказ?***

— Сам вынік бітвы, тое, што зноў мы выйграем, ды інсцэніроўка канцэнтрацыі войскаў ВКЛ не такія істотныя самі па сабе. Важны гістарычны пераказ, каб як найбольшы лік людзей ведаў сваю гістарычную спадчыну. Важнае таксама міжнароднае супрацоўніцтва, галоўным чынам няўрадавых арганізацый пры правядзенні гэтага мерапрыемства, тое, што робім штосьці разам, і што гэта адабраюць нашы грамадствы, гэтая ідэя ўзнаўлення нашай супольнай гісторыі — палякаў, літоўцаў, беларусаў, расіян. Галоўную ролю адыгрывае тут супольная гістарычная памяць у аспекце так усёй Еўропы, як і ў рэгіянальным маштабе. Павага для традыцыі і атаясамліванне з ёю вырашае аб тым, што чалавек з'яўляецца чалавекам. Калі гэтага ён не разумее, не будзе добрым грамадзянінам сваёй краіны. Прытым варта сабе ўсвядоміць, што нельга суадносіць сённяшніх паняццяў айчыны і патрыятызму з тымі 600-гадовай даўнасці. Для беларусаў і іншых народаў увекавечанне тадышніх падзей можа паказаць, што ў нас ёсць супольная, еўрапейская гісторыя.

— ***Дзякуем за размову і жадаем арганізацыйнай перамогі!***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Мастакі аднавілі Грунвальдскую харугву

Узор харугвы вайсковых фармаванняў земляў ВКЛ 1410 года

Рэканструкцыю Грунвальдскай харугвы ажыццявілі мастак Мікола Купава і навуковец, геральдыст Анатоль Цітоў.

Пад гэткімі харугвамі беларускія войскі ваявалі пад Грундвальдам і дасягнулі вялікай перамогі, якая ахінула нашу краіну і яе старажытныя сімвалы славай і гонарам.

Цэнтрам кампазіцыі вайсковых беларускіх харугваў заўсёды была „Пагоня". Харугвы мелі нязначныя адрозненні ў дэталях альбо афарбоўцы.

Тканіна харугвы колеру кармін (шоўк). У цэнтры харугвы выява герба „Пагоня". Конь і вершнік белага колеру (срэбнага). Крыж на шчыце конніка - залаты. Збруя і шчыт рыцара светла-блакітнага колеру з цёплым адценнем. Памер харугвы 110x160 сантыметраў. Астатнія дэталі - прапарцыйна і адпаведна з узорам. Гэта класічная вайсковая харугва з 1410 года і выкарыстоўвалася палкамі ВКЛ. Да іх адносяцца харугвы: Ашмянская, Віленская, Лідская (Віленская зямля). У астатніх харугвах маюцца адмысловыя адрозненні: Амсціслаўская (з Магілёўскай зямлёй і Старадубам) - гунька на кані памаранчавая; Аршанская, Віцебская - гунька зялёная; Берасцейская, Ваўкавыская, Слонімская, Дарагічынская (Берасцейская зямля) - вершнікі ў чорных даспехах; Гарадзенская - чорны конь і чорны вершнік; Мазырская - харугва зялёная; Менская - конь цялеснага колеру. Наваградская - чорны вершнік, залатая збруя; Полацкая - вершнік сталёвага колеру; Пінская - вершнік блакітны, залатая збруя; Смаленская - гунька памаранчавая.

На адваротным баку Берасцейскай і Віленскай харугваў - гарадскія гербы. Гэтыя гарады напрыканцы XIV стагоддзя атрымалі магдэбургскае права. Усе астатнія харугвы маюць з двух бакоў „Пагоню", якая робіцца метадам аплікацыі: у чырвоным полі выразаецца абрыс „Пагоні", у праём ушываецца выява каня з вершнікам.

- Пад гэтымі рэканструяванымі харугвамі дэлегацыі з Беларусі будуць прымаць удзел у паездцы на Грунвальдскае поле 15-18 ліпеня 2010 года, - паведаміў намеснік старшыні аргкамітэта па святкаванню 600-годдзя Грунвальдскай перамогі Мікола Купава.

Арганізатары святочных мерапрыемстваў з удзячнасцю прымуць любую фундатарскую дапамогу ад арганізацый і прыватных асобаў. Па пытаннях удзелу ў падрыхтоўцы і адзначэнні 600-годдзя Грунвальдскай перамогі можна звяртацца па тэлефонах (8-029)5513236, (8-029)3352494, альбо пісаць на: dubrouna@gmail.com.

Рэспубліканскі грамадскі арганізацыйны камітэт па святкаванню 660-годдзя Вітаўта Вялікага і 600-годдзя Грунвальдскай (Дубровенскай) Перамогі.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Беларускі дзень у кветках

Яшчэ месяц да падзеі наша рэдакцыя атрымала прыгожае запрашэнне ў гайнаўскую „шасцёрку". На беларускі дзень. Часам малыя дэталі шмат што высвятляюць, як у выпадку згаданага запрашэння з васількамі на вокладцы. Калі 20 мая г.г. я паехала ў Гайнаўку, захапілася прыгажосцю школьнага свята, якое літаральна патанала ў кветках. І месца, і праграма явіліся як каляровая, радасная вясна. Мы прывыклі, што беларускае свята — гэта спевы і танцы. Вядома, такія прапановы апынуліся ў праграме свята. Цудоўна танчыла „Перапёлка" з Гайнаўскага дома культуры. Прыемна глядзець, калі на сцэну выходзіць моладзь у беларускіх вышыванках і з адчуваннем выконвае народныя танцы. Яшчэ больш здзівіў школьны аматарскі гурток танца (яго вядзе настаўніца беларускай мовы Бэата Кендысь). Дзяўчаты выканалі ўласныя прыдуманыя танцы, між іншым, з вышыванымі ручнікамі. Музычную частку свята ажыццявіў школьны гурт „Гіптоп". Але мастацкая частка была толькі прыгожым пачаткам. Калі пачаліся спаборніцтвы, адзін з бацькоў заўважыў:

— Teraz dopiero się zacznie!

Сапраўды, зала аж завіравала. У каляровых спаборніцтвах — трэба было ўпрыгожыць кветкамі майскае дрэўца або скласці з каляровых элементаў беларускі ўзор — гулялі ўсе малодшыя класы пачатковай школы і іх бацькі ды бабулі. Пасля, пад радасны гоман, адбыліся спартовыя спаборніцтвы (таксама з удзелам бацькоў). Гулялі ўсе дзеці — без розніцы: ходзяць яны на беларускую мову ці не... Як пасля гаварылі бацькі тых, што не ходзяць: так і павінна быць, бо разам жывем ды разам павінны сябраваць і гуляць. Дзеля ідэі сяброўства школа — ідэальнае месца. Беларускі дзень пад кірункам нястомнай Людмілы Грыгарук і яе сяброўак-настаўніц, гэта цудоўны дар для малых і дарослых. Праўда, свята рыхтавалі тут доўга-доўга. Але такая магія старанна падрыхтаваных і зладжаных мерапрыемстваў!

Фота і тэкст: ЗОРКА

Вершы Міры ЛУКШІ

Алінка

Жыла пад пушчай Алінка,
у кудзерках светлых дзяўчынка.
У нетрах лясных заблудзіла
і сон нясонны прысніла:
сніўся ёй сон пра Мікіту,
што жэніцца ён нібыта.
І ў песні цяпер яе кот,
маркотна-вясёлы вуркот:
"Коцік маркотны, кату не спіцца,
быў бестурботны, пара жаніцца!"
Алінка цяпер бабуля,
унучку маленькую люляе,
вядомую песню спявае,
кучмой валос патрасае,
з кудрамі вецер гуляе;
старой не будзе Алінка
ні песня пра кіску дзяўчынкі.

З ПАДЛЯШСКАГА СВЕТУ

Пухлы

Гэтым разам у чарговае падляшскае падарожжа прапаную падацца ў Пухлы Нарваўскай гміны. У гэтай маленькай прынарваўскай вёсцы пабачыць можна чароўную драўляную царкву.

Як сведчаць крыніцы, першым уладальнікам вёскі быў трасцянскі войт Пухловіч. У 1578 годзе паяўляецца першая пісьмовая згадка пра пухлаўскую царкву. Паводле легенды, у гэтым месцы жыў некалі хворы чалавек, які аздаравеў, калі на дрэве з'явілася ікона Багародзіцы.

XVIII стагоддзе не было карысным ні для царквы, ні для саміх Пухлаў. Улетку 1754 года праз гэтыя ваколіцы перайшоў вялікі ўраган, які знішчыў шмат лясоў. Пашкодзіў ён таксама і царкву. Два гады пазней царкву адрамантавалі, але неўзабаве, бо ў 1773 годзе, царква пацярпела ад пажару.

Варта падкрэсліць, што ўжо ў гэты перыяд Пухлы былі вядомым месцам культу Багародзіцы. Якраз тут знаходзілася ікона Пакрова Прасвятой Багародзіцы, якая лічылася цудатворнай.

Пасля пажару ў 1773 годзе на месца спаленай царквы перанесена была капліца з ваколіц Рыбалаў. Паколькі была яна невялікая, напрыканцы XIX стагоддзя ў Пухлах паставілі большы храм. Праіснаваў ён да 1913 года. Якраз тады пабудавана была царква, дзякуючы якой Пухлы сталі вядомымі на ўсім Падляшшы і па-за яго межамі.

Пухлы гэта невялікая мясцовасць, але варта падкрэсліць, што ў мінулым таксама не жыло тут шмат жыхароў. Напрыклад, у 1845 годзе знаходзілася тут 14 дамоў.

Варта наведаць Пухлы, каб пабачыць тутэйшую царкву, а таксама пухлаўскія драўляныя хаты, узведзеныя падляшскімі майстрамі.

Міхась СЦЕПАНЮК

Галерэя дэкламатараў „Роднае слова 2010”

Наталія Сцяшэнка

Аляксандра Зінкевіч

Рыгорка Васілюк

Рыгорка Сурэль

ЭКСКУРСІЯ Ў МІНСК

Першы панядзелак мая, сем гадзін раніцы. Вучні Гайнаўскага белліцэя ўжо гатовыя да выезду. Яшчэ апошняя праверка прысутнасці і мы паехалі. У час дарогі адны спалі, іншыя гутарылі між сабой, а апошнія слухалі музыку, або глядзелі ў акно аўтобуса. Напачатку надвор'е спрыяла экскурсіі... на жаль, толькі да пэўнага моманту.

На граніцы, у час стаянкі, мы нешта з'елі і пакарысталіся туалетам. На шчасце, не трымалі нас там доўга і пасля праверкі пашпартоў і аўтобуса мы паехалі далей. Едучы да месца нашага раскватаравання, мы бачылі палі і часам нейкую старую хату.

На месцы, стомленыя падарожжам, мы апынуліся дзесьці каля дзевятнаццатай гадзіны польскага часу. Якраз час на вячэру. Калі ўсе з'елі, у нас была сустрэча ўдзельнікаў з нашымі апекунамі: спадарамі Яўгенам Янчуком і Янам Карчэўскім, якія растлумачылі нам як будуць выглядаць наступныя дні экскурсіі. Падчас сустрэчы мы пазнаёміліся з катом. Выглядаў не інакш, як нашы польскія, але гэта быў беларускі кот. Спачатку трохі нас баяўся, але потым бегаў каля нас і лашчыўся. Пасля сустрэчы мы вярнуліся ў свае пакоі, каб падрыхтавацца да сну.

Раніцай, у дзевяць гадзін (ужо беларускага часу) было снеданне, пасля якога было ў нас яшчэ трохі часу, каб падрыхтавацца да экскурсіі. На нас чакала Хатынь і экскурсія па Мінску. Да месца забойства беларускіх сялян фашыстамі вядзе спецыяльная дарога, якой даедзем толькі да Хатыні. Дарогу паказвае вялікі, каменны надпіс „Хатынь”. На месцы прывітала нас простая і вузкая дарога, якая прывяла нас пад вялікі помнік. Прадстаўляе ён мужчыну, які трымае на сваіх руках дзіця. Навокал раскінуты прыбудоўкі хат з комінамі, на якіх павешаны званы. У гэтым сумным месцы ўсе экскурсанты з павагай слухалі нашага гіда, які расказаў нам гісторыю гэтага месца. Пасля мы наведалі Мінск, а таксама зрабілі там пакупкі.

На наступны дзень наша экскурсія пераехала ў музей народнай архітэктуры і быту. Знаходзіцца ён пад адкрытым небам. Пабачылі мы там старадаўнія хаты, прылады штодзённага карыстання, школу, царкву, клець, а таксама карчму. Здзівіла мяне гэтае, што ўваход у хату вельмі нізкі. Па гэтай прычыне некалькі асоб, уваходзячы, ударылася галавой. Найбольш спадабалася мне школа — у класе былі такія дзіўныя парты, якія розняцца ад тых, за якімі вучні сядзяць сёння. Абавязкова былі таксама дошка і парта настаўніка. Калісь будынак, які нагадзівай вайне.

На наступны дзень, пасля снедання, мы, поўныя ўражанняў, паехалі дадому. Па-мойму, экскурсія мінула надта хутка. Шкада, што надвор'е нам не спрыяла. Ужо не магу дачакацца наступнага такога мерапрыемства. Гэта была мая найлепшая экскурсія і я ведаю, што не толькі мне яна так падабалася.

Пётр ГЕРАСІМЮК
Гайнаўскі белліцэй

Музыка з кайфам

Дзівосны „Dzivasil”

„Музыку можам разумець у падобны спосаб як колер святла ці гук дажджу”. Так пра свой падыход да музыкі гаварыў Браян Эно, класік жанру, які сёння называем амб'ент. Калі параўнаць гэтыя музычныя пошукі да жывапісу, будзем вельмі блізка імпрэсіянізму, кірунку, які найпрасцей зразумеем, уяўляючы сабе эмацыянальныя плямы на целе акружаючага свету. Далёка мы завандравалі сёння ў нашых пошуках, але, нягледзячы на гэтую абстрактнасць, пунктам выхаду з'яўляецца не абстрактны, а сапраўдны гурт „Dzivasil”.

Назва „Dzivasil” — невыпадковая. Выводзіцца яна ад міфічнай кветкі, якая ў паганскім беларускім свеце прыносіла дзівосную сілу. У сённяшнім разуменні дорыць яна выдатным музыкам энергію змагацца з уласным уяўленнем. Удзельнікі гурту — прафесіяналы, таму яны не арыентуюцца толькі на элегантнасць гукаў, толькі шукаюць у музыцы нечага іншага. Зараз рэалізуюць яны сваю ўяву беларускасці. Паводле іх, музыка — гэта „ўспамін успаміну”, асабліва пра людзей, якіх імёны і памяць не захаваліся, а іхнюю спадчыну рэалізаваць можна працягваючы традыцыі беларускай культуры. Найпрасцей (хаця сучаснікам не так лёгка) адлюстроўваецца яна ў аўтэнтычным фальклоры. Усё, што далей, можна называць рэхам. Рэхам будзе і фольк, і паганметал, але таксама этна-амб'ент. Да такога жанру прыпісваюць „Dzivasil” музычныя крытыкі. У амб'енце, які патрабуе гуку, а не канкрэтнай паслядоўнасці, ёсць месца на далёкія вандроўкі ў куткі беларускай памяці, якая спалучаецца з сучасным ці нават футурыстычным гучаннем музыкі.

„Dzivasil” не працуе яшчэ надта доўга, але падыход да музыкі ўдзельнікаў гурту захапляе чарговых прыхільнікаў. Іхняя музыка будуецца з выпрабоўвання беларускай культуры ды розных фонаў, якія становяцца фонам і нашага жыцця, жыцця слухача. Што цікава, амб'ент найчасцей асацыюецца з электроннымі формамі музыкі. У выпадку гурту „Dzivasil” уся музыка гучыць ужывую. Усе эфекты, фоны, медытацыйныя фразы іграюць музыкі, а не камп'ютар. У гэтым дзівосная і сапраўдная сіла гэтага праекта.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 23

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 19:

Аса, нага, ручай, кураслеп, каса, рама, рака, кроў, повад, нага, ар, груша, сыр. Заапарк, арт, на, мо, ар, рукаў, шкура, наш, час, пара, насарог, майл, аванс, елка, карп, адбор.

Узнагароды, кашулькі з лагатыпам „Радыё Рацыя”, выйгралі Адрыян Жукоўскі, Наталля Тарасюк з Дубін, Паўліна Паплаўская з Бельска-Падляшскага.



Бяседа пад троіцкімі бярозкамі

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Юстына Кананюк, Анна Келбашэўская, Эмілія Масайла

— *Гожэ вашэ село Тыневічы!*

— *Але! Асфальтуовку зробілі, то і гожэ...*

Не пра асфальтаваную дарогу я думала, выказваючы ўголас захапленне вёскай Вялікія Тыневічы. Спадабалася мне агульная чысціня і дагледжанасць панадворкаў ля старых дамоў, прыаздобленых агародчыкамі з чырвонымі цюльпанамі і квітнеючымі яблынькамі. І бяседная атмасфера напярэдадні нядзелі. На многіх панадворках, застаўленых нямецкімі і японскімі машынамі, грылявалі гарадскія дзеці і ўнукі, абавязкова пад музыку гуртоў „Ас" або „Прымакі". Старажылы прыселі на лавачках ля хат...

— Пайшлі ў святліцу, беларускія выступленні паглядзім, — прапануем тром бабулям, апранутым як на фэст...

— *Вы молодыя ідітэ*, — адказваюць, — нам, старым, музыкі не мілы, усё баліць, косці круціць...

У апошнім тлумачэнні мы адчулі нешта накшталт: *прабачце, але нам нельга!* Пасля даведаемся, што ў той самы дзень у вёсцы пахавалі *Літоўку*, праўда, старажылку адпявалі ў яе хаце, а не як апошнім часам прынята ў Вялікіх Тыневічах, у будынку былой школы, перароблена на святліцу. (Чытача можа зацікавіць мянушка пакойніцы, якая сама па сабе нясе цікавую інфармацыю. У Нарваўскай гміне *літоўкі і ліцьвіны* не грамадзне Літвы, толькі жыхары суседняй Нараўчанскай гміны, якіх у мінулым раздзяляла мяжа паміж ВКЛ і Каронай).

Мерапрыемства пад лозунгам *Жыве яшчэ традыцыя* запланавалі пачаткова на 12 красавіка, аднак па прычыне нацыянальнай жалобы перанеслі яго на 15 мая, у перыяд паміж Юр'ем і Тройцай — вясновымі святамі, якія самі па сабе мелі складаць праграму культурнай вечарыны.

* * *

На ганку святліцы, аздобленым патроіцку бярозкамі, сустракаю Тамару Юшкевіч. Дырэктар гміннага асяродка культуры не скрывае хвалявання. За дваццаць хвілін мерапрыемства, а гасцей як на лякарста! Ці будзе хоць для каго выступаць? Жалобная атмасфера ў краіне, раней Смаленская катастрофа, а зараз паводкі, цалкам адабралі ахвоту *наігрываць* — як бы сказалі пра імпрэзы са спевамі і скокамі ў наваколлі: *Кунэц світа блізко, а вам оно наігрываті*. Не без упслыву і тыя мярліны, якія выскачылі ў сяле якраз пад іх вечарыну.

— Наш бацюшка то *на Камароўскага паехаў*, — тлумачаць непрысутнасць свайго настаяцеля хлопцы з Ласінскай парафіі.

Кандыдат у прэзідэнты РП Браніслаў Камароўскі не абмінуў Гайнаўскіх дзён царкоўнай музыкі (ладжаных клірам і гайнаўскімі палітыкамі). Ласінскі настаяцель быў запрошаны разам з прыцаркоўным калектывам *Рамонка*, які традыцыйна стаў лаўрэатам фестывалю. Праўда, ганаровы прыз намнога менш цікавіў маіх субяседнікаў, чым візіт кандыдата ў прэзідэнты, які тут меў прызнакі сенсацыі...

— То чаму і вы самі не паехалі паглядзець на будучага прэзідэнта? — пытаю ў іх, у прыватнасці сяброў па школьнай парце, зараз бацькоў школьнікаў, якія будуць выступаць на сцэне ў Вялікіх Тыневічах.

— *Хай пэруч выграе, то тогды поедэм!* — чую знаёмы адказ.

Прыведзены каментарый выклікала асоба тыневіцкага настаяцеля, у прыватнасці роднага брата ласінскага святара. Айцец Андрэй разам з матушкай першымі з'явіліся ў святліцы. На сцэне будуць выступаць іх дзеці: Сара і Ерамей.

— Вёска старэе, — кажа святар. — Добра калі хоць раз у год пашанцуе ахрысціць якое дзіцятка. Ды і тое ахрысцяць і адразу вязуць дзесьці ў свет. А памірае найменш чалавек пяць. А парафія ў нас малая — восемдзесят сем'яў. Дзве вёскі: Вялікія Тыневічы і Лапухоўка.

— І яшчэ Забалацце, — заступаюся за лясны хутар, каларытную кропку ў наваколлі.

— Там дзве асобы ўжо асталіся... — чую ў адказ.

Калі гутарым пра адміранне вёсак, падыходзіць бабуля і без слова цалуе айца Андрэя ў руку.

У шэсць гадзін вечара публіка ўжо ў камплекце. Па сённяшні дзень я пад уражаннем мабільнасці жыхароў гміны. Праўда, мала хто перамяшчаецца сёння на сваіх дваіх. Даехаць на машыне ў любы куток гміны — справа дзесяці-дваццаці хвілін. Вось і зараз, калі мы наракалі на дэпрэсіўны красавік і дажджлівы май, як з-пад зямлі з'ехалася публіка. У апошні міг, літаральна пяць хвілін да выступленняў. Пані Тамарка аж павесялела. Культурныя мерапрыемствы ў гміне Нарва прымеркаваныя да дэмаграфічнай сітуацыі і ментальнасці людзей. Арганізатары ведаюць, што каб прыцягнуць публіку, трэба запрасіць на сцэну школьнікаў. Разам прыедуць бацькі і сямейка, сябры, прыйдуць сваякі. Словам, будзе для каго пастарацца, бо не заўсёды людзі ў састарэлых мясцінах і вёсках ахвотныя ўдзельнічаць у агранізаваных мерапрыемствах. Перашкодай стала і спадарожнікавае тэлебачанне, антэнамі-„талеркамі" якога густа абсталяваная ўся гміна. Таму мерапрыемствы з цыкла *Жыве яшчэ традыцыя* старанна абдуманыя і дэталёва падрыхтаваныя. Тут спрацоўваюць усе патрэбныя элементы — бацькі могуць палюбавацца выступленнем сваіх дзетак, для шырэйшай і выпадковай публікі прапануецца канцэрт, запрошаных гасцей заўсёды чакае шчодры беларускі пачастунак. Ранг мерапрыемства падбівае гмінная вярхушка з войтам Якубам Садоўскім і старшынёй Рады гміны Яўгенам Дудзічам на чале (абодва родам з Тыневіч). Гмінныя святкі наведваюць праваслаўныя і каталіцкія святары з усёй гміны, працаўнікі культурных устаноў, захавальнікі спадчыны, м.інш. спадар Міхал Філяновіч са Скарышэва, настаўнікі і дырэкцыі школ, бізнесмены фірмы „Пронар", музыкі-аматары з суседніх гмін і т.зв. бывалыя людзі, якія не абмінуць ні аднаго мерапрыемства. Словам, уся патрэбная для жыцця і прэстыжу тусоўка.

* * *

У перапынку паміж выступленнямі дзяцей і музычнага гурту „Narva" гутарым з настаўніцай Нінай Абрамюк.

— Я пад уражаннем, што ў сцэнарыі вашай п'есы пра *Юр'е* выступаюць знаёмыя мне авечкі на папасе ля Антолькавага дуба. Сёння, калі мы з братам ехалі ў Тыневічы, я з настальгіяй паглядзела на тое месца пад Забалаццем, дзе трыццаць гадоў таму пасвіліся статкі авечак, кароў, табуны коней...

— Ну, так! — усміхаецца настаўніца. — Тыя авечкі ведаю са школы. Калі я была настаўніцай у Ласінцы, дзеці з Кутлоўкі не прыходзілі па дваты дні на ўрокі. Пасля яны прыносілі пісулькі ад бацькоў, што ім выпала чарга пасвіць авечак і яны не маглі хадзіць у школу. Іх таксама цяжка было аставіць пасля ўрокаў, бо ўсе спяшаліся пасвіць авечак. Такое памятаецца, таму я змясціла іх у п'есе.

Сцэнарыі, якія піша Ніна Абрамюк, не толькі грэюць успаміны, яны маюць адукацыйны характар. Сюжэты, як згаданая п'еса *Юр'е*, пабудаваныя на этнаграфічным матэрыяле вёсак Нарваўскай гміны. Крыніцай натхнення для яе былі жанчыны з роднай вёскі Навіны ды асоба цёшчы з сяла Вялікія Тыневічы. Напісаць этнаграфічны спектакль пра Юр'е не простая справа. Абрад знаходзіўся ў цяні памінальна-парафіяльнага свята, якое адзначаюць на могілках у Ласінцы. Некаторыя павер'і запазычыла яна са зборніка *Ад абраднасці да тоеснасці*, напісанага і выдадзенага бацькамі польска-беларускага прадшколля ў Беластоку.

Мерапрыемствы з цыкла *Жыве яшчэ традыцыя* творча матывіравалі настаўніц Люцыну Рушук і Ірыну Мілько. Яны, у сваю чаргу, напісалі п'еску пра *Тройцу*. У цэнтры святкавання — паездка ў Крыначку. На пілігрымку ў пушчанскае ўрочышча са святой вадой прыпушчанскія парафіі з Падляшша едуць у трэці дзень Тройцы. На месцы, ужо пасля багаслужбы, сярод святлістай дубровы сем'і ладзяць пікнік. Асаблівасць спектакля пра троіцкія абрады заключаецца ў тым, што ён пастаўлены на мясцовым дыялекце вёсак Ласінка і Іванкі (адсюль родам спадарыні Люцына і Ірына). Ролі жыхароў прыпушчанскіх вёсак і гарадскіх сваякоў (польскамоўных) выконваюць дзеткі наймалодшых класаў ПШ у Нарве. Калі дадаць, што сцэнарый напісалі нарваўскія настаўніцы пачатковага навучання, можна сказаць, што рэканструкцыя народных звычаяў і прамоцыя мовы выйшла па-за межы ўрокаў беларускай мовы. За гэта маленькія акцёры атрымалі гучныя апладысменты ад удзячнай тыневіцкай публікі.

Выступае гурт „Narva"

* * *

Сапраўдны фурор, дарэчы не першы ўжо раз, выклікалі тры самародныя акцёркі-гімназісткі: Аня Келбашэўская, Эмілія Масайла, Юліта Кананюк. Дзяўчаты ў гумарыстычны (і месцамі грубаваты) спосаб пракаментавалі паводзіны мясцовых палітыкаў, сваіх настаўнікаў, мясцовых аўтарытэтаў, якія не дазволілі арганізаваць забавы на Юр'е ў Ласінцы. Аўтарская пастаноўка маладых на дыялекце парафіі Ласінка ў стылі кабарэ здорава дапоўніла праграму мерапрыемства. Але мяне найбольш захапілі Дамініка Юшкевіч і Сара Сілівонюк. Гімназісткі праспявалі песні славутых „Тыневічанак", якія ўжо не выступаюць з канцэртамі, аднак іх славуты шэўдэр *Дзе бы ты не пасяліўся* ведае ўся Беласточчына. Менавіта, Вялікія Тыневічы найбольш для мяне гожыя з-за іх песень.

Ліст з Плянты

Вялікі дзякуй за альбом з вершамі Міры Лукшы „Жывінікі з глыбінкі" („Ніва", Беласток 2009). Неспадзявана наведаў мяне 12 красавіка 2010 г. „Леў з Ляўкова" — Янка Целушэцкі і ўручыў мне падарунак як аднаму з найстарэйшых падпісчыкаў „Нівы" і былому карэспандэнту. „Ніву" я чытаю ад першага нумара ў 1956 годзе. Памятаю, якая была радасць, калі засноўваліся першыя гурткі Беларускага грамадска-культурнага таварыства па вёсках! У нашай Плянце было каля дваццаці чалавек членаў. Я збіраў месячныя складчыны і перасылаў у Гайнаўку. Памятаю, першы фэст сарганізаваў і рабіў дэкарацыю на паляне ў лесе недалёка чыгункі і станцыі Нараўка малады хлапец — Сакрат Яновіч з Крынак, а памагала яму моладзь з Плянты. Была музыка і песні, жараб'ёўка, публіка весялілася да позняга вечара. Не забудуць нашы жыхары ансамбля „Лявоніха" і танцора артыста Янкі Крупы. Янка, няхай табе зямля пухам будзе, адпачывай спакойна ад трудоў, якія паклаў ты для культуры беларусаў і палякаў!.. Дзякуючы БГКТ многа калектываў выступіла ў нашай святліцы.

Уладзімір КЛІМЮК

Ад першага нумара „Нівы" карэспандэнты і журналісты стараюцца чытачам данесці пра ўсё, што адбываецца ў Польшчы і Беларусі. Цяпер у „Ніве" журналісты, якія маладзейшыя ад нашай „Нівы"— Міра Лукша, Ганна Кандрацюк, Ілона Карпюк. Аляксей Мароз добра ведае жыццё земляроба. Умела апісвае людзей і кожную галіну нашага жыцця ў наш час. Аляксандр Вярбіцкі здзёр не адны боты на нашых дарогах, у пошуках мінулага і цяперашняга нашых вёсак і ўсяе тэрыторыі. Не крыўдуй на мяне, Янка „Леў з Ляўкова", што я не пісаў пра цябе на першым месцы: ты і так найбліжэй нас тут жывеш — ты не пасядзіш у хаце, усё ў дарозе — на ровары, у аўтобусе ці пешшу, а твае сакаліныя вочы ўбачаць усе непарадкі. Апісваеш нашу Нараўчанскую гміну, Гайнаўскі і Беластоцкі паветы, сам Беласток, Міхалоўскую гміну, вербуеш многа чытачоў тыднёвіку „Ніва". Будзь заўжды бадзёрым і маладым, заступаючыся за ўсіх — ад малога дзіцяці да старых людзей, якім неабходная дапамога іншага чалавека. Янка Целушэцкі як радны многа ўклаў сіл, выступаючы на сесіях нараўчанскай Гміннай рады, для паляпшэння жыцця людзей. Не магу забыцца і не напісаць пра працавітых карэспандэнтаў Мікалая Панфілюка з Дубіч-Царкоўных і Уладзіміра Сідарука з Кузавы, Віктара Буру з Рыбакоў што над Семяноўскім залівам, Мікалая Варанецкага з Альхоўкі. Каго не пералічыў з заслужаных, дык даруйце старому прадзеду.

Асабліва я ўдзячны і жадаю яму многа гадоў жыцця ў здароўі Віктару Шведу, вялікаму таленту, які шмат напісаў вершаў для дзяцей і дарослых беларусаў. Зімой і летам трымайся, ідзі з ветрам ды часам трэба і супраць ветру!

Хачу сказаць пару слоў пра пакойнага Кастуся Майсеню. Які ён меў арганізацыйны дар! Колькі ён зрабіў усяго для Гайнаўшчыны, для беларусаў! Засталіся ягоныя крамы па вёсках, комплекс магазінаў на Гурным, Беларускі музей. На сходах людзі яго слухалі з увагай і вялікай павагай. Голас у яго быў мілы, ды патрабуючы і мабілізуючы людзей да пабудовы запланаваных заданняў. Імя Кастуся Майсені павінна не толькі быць напісана вялікімі літарамі на Музеі, але і Паркавай вуліцы павінны даць імя Канстанціна Майсені. Многія з нас даклаліся да пабудовы Беларускага музея, і павінен ён такім быць.

Не магу даўмецца, чаму паміж беларусамі наступіў такі раскол. БГКТ было моцнае і яднала тысячы беларусаў у Польшчы. Унесла свой вялікі ўклад у арганізацыю фестываляў і фэстаў і іншых беларускіх сустрэч. На маю думку, трэба сесці за адным сталом з Янкам Сычэўскім і сябрамі беларускага таварыства і абмеркаваць важныя беларускія справы, для поспехаў у далейшым жыцці. Нават калі будзе спачатку не па дарозе, трэба працягваць перамовы. Няма людзей беспамылковых — той не памыляецца, хто нічога не робіць.

Уладзімір КЛІМЮК

Чаромхаўскія імпрэзы

Уладзімір СІДАРУК

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

На канцэрце гурту „Гуляй-город" артысты гулялі з публікай

Надыходзіць лета — самы спрыяльны час для арганізавання культурных мерапрыемстваў на ўлонні натуры. Прыгадваюцца мне народныя фэсты і пікнікі пад адкрытым небам, якія пры камуне праходзілі побач Дома культуры ў Чаромсе. Людзі гулялі, весяліліся, цешыліся жыццём. Але з прыходам суровых прынцыпаў рынкавай эканомікі многае перамянілася. Міністэрства культуры і народнай спадчыны абмежавала фінансавыя сродкі для Беларускага таварыства на арганізаванне фэстаў. Для Чаромхі адным з большых мерапрыемстваў застаецца зараз Міжнародны фестываль «Сустрэчы з народным мастацтвам „З вясковага панадворка"». Гэта цыклічная імпрэза заваёўвае ўсё большую папулярнасць не толькі ў краіне, але і за яе мяжой. Сведчыць аб гэтым лік выступаючых штогод калектываў і шматлюдная публіка.

14 траўня ў мясцовым ГОКу выступіла фолькавая група „Гуляй-город" з Кіева. Гурт пад кіраўніцтвам Сяргея Пастольнікава гасцяваў па запрашэнню Таварыства аматараў нацыянальнай культуры і лічыцца прэлюдыяй да набліжаючагася фестывалю, якога юбілейны XV выпуск адбудзецца пры канцы ліпеня. А вось што гавораць на гэтую тэму арганізатары мерапрыемства, сужонства Барбара і Міраслаў Самасюкі.

— Сёлета будзем адзначаць пятнаццацігоддзе фолькавых сустрэч, — кажа Барбара Кузуб-Самасюк, лідэр „Чарамшыны" і заадно арганізатар фестывалю. — Каб адпаведна запрэзентаваць Чаромху ў імпрэзе, рашыліся мы на некалькі перамен у арганізацыйных справах. Асноўная — гэта час імпрэзы. Ад нейкага часу чуліся галасы, што пачатак чэрвеня неадпаведны па прычыне надвор'я, якое бывае халоднае і дажджлівае і тады публіка падводзіць. Таму рашылі мы перанесці мерапрыемства на ліпень — сезон летняга адпачынку. Чаромхаўская, як і суседнія Кляшчэлеўская і Дубіцкая гміны карыстаюцца агратурыстычнымі каштоўнасцямі: вадаёмамі ў Рэпчычах і на Бахматах, навакольнымі лясамі з ягадамі і грыбамі ды і Белавежская пушча як рукой падаць.

— Для гэтай мэты ўзнікла ідэя, — уключаецца ў размову Міраслаў Самасюк. — Хочам пусціць у ход спецыяльны цягнік з Варшавы ў Чаромху. Гэтым цягнікам аматары фолькавай музыкі з цэнтральнай (ды не толькі) Польшчы маглі б прыехаць на нашу імпрэзу ў пятніцу 23 ліпеня (пасля абеду), а вярталіся б у нядзелю адвячоркам. Такім чынам госці не толькі змаглі б паглядзець канцэрты фолькавых гуртоў, але і наведаць наваколле. Я, як чыгуначнік, правёў ужо ўступную размову са сваім начальнікам у Беластоку, — кажа Міраслаў Самасюк. — Ён абяцаў, што адмовіцца ад платы за праезд цягніка на лініі Варшава — Чаромха. Гэта ў пераліку на грошы складае суму каля чатырох тысяч злотых. Застаецца адно дамовіцца з перавозчыкам. Але аб гэтым рашаць будзе аўкцыён. Разумеецца, што пакарыстаемся таннейшым перавозчыкам.

— У заканчэнні хачу адзначыць, — дадае спадарыня Барбара, — што сёлетні XV Фестываль не толькі пашыраецца ў часе, але і багацейшы на атракцыёны. Арганізатары задбалі, каб прыезджыя госці, як і мясцовая грамадскасць змаглі на працягу двух тыдняў прыемна і культурна правесці летні адпачынак. Затым прапануем:

— 23-25 ліпеня — канцэрты фолькавай музыкі з удзелам айчынных і замежных гуртоў;

— 26-30 ліпеня — майстар-класы, дэманстрацыя фільмаў;

— 31 ліпеня — „Джэрэла" — украінскія традыцыі і трансфармацыі;

— 4 жніўня — „Вэртэп" — Міжнародны мастацкі фестываль;

Абагульняючы вышэйсказанае, — завяршае расказ Барбара Кузуб-Самасюк, — сёлета арганізатары «Сустрэчы з народным мастацтвам „З вясковага панадворка"» намагаліся так скласці праграму, каб не перашкодзіць удзельнікам у іншых імпрэзах арганізаваных у наваколлі. Маю тут на думцы Купалле ў Дубічах-Царкоўных ці ў Белавежы.

Застаецца адно пажадаць арганізатарам чаромхаўскай імпрэзы цудоўнага, сонечнага надвор'я і... шматлюднай публікі.

Затым, да сустрэчы на фестывалі!

ДЭБЮТ

Кацярына МАЙСЕЙЧЫК

Родам з Беларусі зараз жыве ў Польшчы. Студэнтка беларусістыкі ў Варшаве.

Я вітаю вас

Я вітаю вас
Сонцам яскравым,
Слязою і шчасцем
І жадаю каб не было нянасця.

Я вітаю вас
Рэчкай у лесе,
Сцежкай у полі і морам сінім
І жадаю каб усе мелі сілы.

Я вітаю вас
Небам празрыстым,
Зоркай у начы і кропляй у водзе,
Я хачу каб усе жылі ў згодзе.

***

Не лямантуй, не суецца,
А ўсё ж вазьмі і памаліся,
Калі бяда цябе прыцісне
І гора табе зубы сцісне.

Не лямантуй, не суецца,
А ўсё ж вазьмі і памаліся,
Калі няшчасці чарадою,
Даўно вісяць над галавою.

Бомж

Ты жыў і працаваў сумленна,
Сваё жыццё ты занядбаў,
А страціўшы ўсё дарэмна,
Ты ворагам сабе не стаў.

Гады ляцяць, як птушкі ў вырай,
Ужо сівая галава,
Чаго дабіўся працай гэтай?
Даўно ўжо вызначыць пара.

І чэсным быў ты чалавекам,
Любіў дзяцей, хаця сваіх не меў,
Ты зразумеў усё гэта познім летам,
Тады сям'ю ствараць ужо не хацеў.

Адзін застаўся ты на гэтым свеце,
Бацькоў даўным-даўно няма,
Браты ўсе маюць жанок, дзяцей,
А дзе ж яны? — пытаеш сам сябе, Фама.

Вакзал — то для цябе і сховішча, і дом,
А вуліца — то ўся твая надзея,
Сядзіш на лаўцы і чытаеш разарваны том,
Навокал людзі снуюць, адбываюцца падзеі.

А як змяніўся ты, пазнаць цябе не можна,
З вачэй знікнула радасць хіба назаўжды,
Як хтосьці крыкне дзесь
— Ты азіраешся трывожна,
Калісьці й ты не знаў ні гора, ні нужды.

Увесь свет перавярнуўся дагары нагамі,
Вакол цябе пануюць бруды і смурод,
І дзеці паказваюць на цябе пальцамі,
Крычаць: „Глядзіце! Унь ідзе ўрод!"

Хаваешся ты пад мастом ад бураў,
Гарэлку п'еш што хтосьці не дапіў,
Ты — чалавек, таксама маеш нораў
І марыш каб цябе твой лёс дабіў.

Твая віна і толькі і не толькі,
Што праз жыццё прайшоў так уздоўж,
Але затое перад усім цяпер ты стойкі,
Наш родны, беларускі бомж.

Памяць пра чалавека знікае, астаецца яго творчасць

Міхась КУПТЭЛЬ

Фота Радаслава КШЭВІНЫ

Па двух гадзінах падарожжа ў слаўны, насычаны санаторыямі горад Інаўроцлаў прывітала мяне табліца з інфармацыяй, што знаходжуся ў „Санаторнай зоне А". Калі ёсць зона „А", падумаў я, значыць, ёсь пэўна зона „Б" і „В". Потым, калі трохі разгледзеў геаграфію санаторнай часткі горада зоны „Б", далейшых па алфавіце зон не сустрэў. Тым не менш тое, што буду жыць некалькі тыдняў у зоне „А" і падмацоўваць сваё здароўе, дзякуючы цудоўным асаблівасцям інаўроцлаўскіх саланцоў — мінеральных вод з наяўнасцю солі — цешыла, бо фактычна наваколле „Саланчаковага парку" пазітыўна настройвала на будучы побыт.

Калі мая сяброўка Лена даведалася, што еду ў санаторый у Інаўроцлаў, слаўны горад Куяўскай зямлі, паставіла задачу атрымаць назад два бел-чырвона-белыя сцяжкі ад уласніка друкарні „Позкаль" Тадэвуша Хенсы і матэрыялаў з выставы ад Пятра Мільхерта.

А ўсё гэта па той прычыне, што ў 2004 годзе, значыць шэсць гадоў таму, беларускае асяроддзе ў Польшчы, перш за ўсё дзякуючы Лене Казлоўскай, наладзіла, разам з уладамі горада, урачыстасць прымеркаваную да 20-й гадавіны з дня смерці Язэпа Найдзюка, вядомага жыхарам горада як Юзэф Александровіч, які ў ваеннае ліхалецце „прыблукаўся" з далёкай Беларусі ў Інаўроцлаў і, замест служыць свайму народу, цэлы свой творчы патэнцыял прысвяціў Куяўскай зямлі (http://www.inowroclaw.info.pl/aktualnosci.php?akcja=news&id=1627).

Зацікаўленых чытачоў бурлівым жыццём Язэпа Найдзюка адсылаю на сайт штомесячніка „Czasopis", дзе можна прачытаць змястоўны артыкул Л. Казлоўскай (**http://www.slonko.com.pl/czasopis/in.php?id=0402/2004_02_c13**).

Урачыстасць была настолькі прэстыжная, што ад усхвалявання ніхто не памятаў, каб забраць з сабой на канец сцяжкі і матэрыялы з выставы, прысвечанай Язэпу Найдзюку. Мая місія вяртання сцяжкоў і матэрыялаў не ўдалася. Сцяжкі, як сказаў спадар Т. Хенсы, нейкія беларусы забралі, а матэрыялы з выставы Пётр Мільхерт перадаў дачцэ Язэпа Найдзюка, якая ў сваю чаргу ўвесь бацькаў архіў перадала Інаўроцлаўскаму аддзелу Дзяржаўнага архіва ў Быдгашчы.

Вядома, што мне не раўняцца з прафесійным даследаваннем жыццёвага шляху друкара і выдаўца, культурнага і грамадскага дзеяча, даследчыка мінулага Куяўскай зямлі.

Як кажа былы галоўны механік Т. Хэнсы (а зараз уласнік) Куяўскай друкарні, дырэктарам якой быў Я. Найдзюк, дырэктар быў вельмі актыўным дзеячам. Пісаў артыкулы для перыядычных выданняў Польскага гістарычнага таварыства, у часопіс „Зямля Куяўская" — якога быў членам рэдакцыйнага камітэта. Па яго ініцыятыве паўстала Таварыства любіцеляў Куяўскай зямлі. У санаторнай бібліятэцы знайшоў я турыстычны даведнік Юзэфа Александровіча „Inowrocław i okolice" — чацвёртае выданне, затым вельмі прыдатнае як бачым.

З больш змястоўнай біяграфіяй Язэпа Найдзюка можна пазнаёміцца ў „Inowrocławskim Słowniku Biograficznym" (т. III, 1997 г., аўтары: П. Мільхерт і Э. Міколайчак).

Цікавіла мяне ці хтосьці з жыхароў Інаўроцлава ведае кім быў Ю. Александровіч. Вядома, што сацыялагічнага апытання я не змог правесці, але некалькі асоб удалося апытаць. Культурна-асветны інструктар — як бачым яшчэ не загінула такая пасада — у санаторыі Галіна Котас сказала, што прозвішча Александровіч для яе не з'яўляецца невядомым, паколькі ў санаторнай бібліятэцы захоўваюцца ягоныя кніжкі, прыкладова „Inowrocław i okolice". Тое ж самае сказала іншая працаўніца Гарадской бібліятэкі Ірэна Ганоўская.

Вядома, што працаўнікі друкарні „Позкаль", колішняй Куяўскай, на будынку якой знаходзіцца мемарыяльная дошка (на здымку) у гонар былога дырэктара гэтай друкарні, ведаюць кім быў Юзэф Александровіч — Язэп Найдзюк, хоць вартаўнікі на браме думалі, што быў ён украінцам.

Як бачым, памяць пра чалавека знікае, астаецца толькі яго творчасць у той ці іншай форме.

http://birdwatch.by

Вось і надышло лета — пара спякотнага надвор'я, гаманлівага лісця, цёплых вецяркоў і птушынага шчабятання. Апошняе настолькі звыклае для чалавечага вуха, што гэтыя свісты і траскаценне бывае і не заўважаеш. Але ёсць людзі, якім залежыць на тым, каб у птушыным хоры гучала як мага больш галасоў.

Натуралісты, што адсочваюць жыццё дзікіх птушак, дзейнічаюць у кожнай краіне. Не выключэнне тут і Польшча з Беларуссю. Дарэчы, яны ведаюць адны пра другіх — аб чым расказваецца на сайце, што мае назву Birdwatch.by, і які месціцца па аналагічным адрасе ў інтэрнэце.

„Вы зайшлі на сайт, прысвечаны назіранням за птушкамі ў Беларусі, — вітаюць уладальнікі сайта яго гасцей. — Па-англійску для гэтага занятку ёсць агульнапрыняты тэрмін — birdwatch. Адсюль паходзіць і назва нашага сайта. Варта ўзгадаць, што гэтае хобі толькі ў ЗША як асноўнае ўзгадваюць больш 51 мільёна чалавек! Спадзяемся, што з дапамогай гэтага сайта назіранні за птушкамі стануць больш папулярнымі".

Што ж тычыцца сайта, то яго выгляд вельмі прафесійны і адносна арыгінальны — падзелены на дзве часткі, ён пафарбаваны ў блакітны, сіні і зялёны колеры. Выйсці да рубрык месцяцца ўверсе выяўлення, а з левага боку — апошнія назіранні за птушкамі.

Бёдуотчары, як называюць сябе назіральнікі за птушкамі адным з галоўных напрамкаў сваёй дзейнасці лічаць адсочванне і фіксаванне момантаў жыцця іх птушыных любімцаў. Згодна інфармацыі, што месціцца на старонцы „Вызначальнік", да такіх яны адносяць вераб'я, малую крычку і сокала-пустальгу. Пра апошнюю птушку, дарэчы, распавядаецца на галоўнай старонцы, якая з'яўляецца своеасаблівай стужкай навін.

Важнай адметнасцю сайта з'яўляецца і тое, што практычна да кожнага расповеду дадаецца фотаздымак. На пераважнай большасці з іх, зразумела, — птушкі. Найбольшая колькасць фотаздымкаў, як і мае быць, месціцца на старонцы „Галерэя". Акрамя птушыных фотарасповедаў, там можна пазнаёміцца і з фотасведчаннямі разнастайных натуралістычных мерапрыемстваў.

Калі цікаўны карыстальнік пажадае пазнаёміцца з назіраннямі бёдуотчараў, то яму варта будзе зазірнуць у рубрыку „Нашы назіранні". Там месціцца мноства расповедаў ад сведак птушынага жыцця. Свае назіранні натуралісты выкладаюць на сайт на беларускай і рускай мовах.

Зразумела, не з кожнага месца можна пабачыць цікавую птушку, паглядзець як яна, напрыклад, корміць птушанят альбо ўзлятае ў неба. На сайце беларускіх бёдуотчараў існуе рубрыка „Месцы назіранняў". Праўда, пра такія месцы даведацца ўдасца толькі тады, калі гэта тычыцца Гарадзеншчыны і Берасцейшчыны. У астатніх рэгіёнах Беларусі назіранне за птушкамі можа і вядзецца, але на данай старонцы пра тое нічога не распавядаецца.

Пра тое, што бёдуотчары аб'яднаныя ў адну арганізацыю, мова на старонцы „Аб АПБ", якая адначасова з'яўляецца самастойным сайтам. АПБ у даным выпадку — „Ахова птушак Бацькаўшчыны", мэта дзейнасці якой — клопат аб разнагалоссі птушынага хору, або, гаворачы па-навуковаму, аб „захаванні біялагічнай разнастайнасці і заахвочванні насельніцтва да актыўнай аховы прыроды".

Рубрыка „Спасылкі" пазнаёміць нас з сайтам бёдуотчараў Польшчы.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Развітанне з вясной

Надышла пара развітання са спартовай вясной. Травень не прынёс асабліва станоўчых эмоцый заўзятарам хакея — зборная Беларусі не здолела трапіць у чвэрцьфінал чэмпіянату свету, задаволіўшыся мінімумам. Затое пачаліся старты ў весляроў на байдарках і каноэ, якіх і назавем лепшай камандай месяца. Яна пацвердзіла свой высокі клас на этапе Кубка свету, што прайшоў у французскім горадзе Вішы. Заваявана ажно 7 узнагарод. На вышэйшую прыступку п'едэстала ўзняліся алімпійскія чэмпіёны браты **Андрэй** і **Аляксандр Багдановічы**, якім не было роўных на кароннай кіламетровай дыстанцыі сярод каноэ-двоек. Яны ж разам з **Дзмітрыем Рабчанкам** і **Аляксандрам Ваўчэцкім** выйгралі спабор чацвёрак. Яшчэ адзін залаты медаль здабыў **Дзяніс Гаража** ў фінальным заездзе каноэ-адзіночак на адрэзку 500 метраў. Сярэбранымі прызёрамі сталі **Алег Юрэня** сярод байдарак на 1000 м, а таксама экіпаж каноэ-двойкі, які складалі Рабчанка і Ваўчэцкі на дыстанцыі 500 м. Алімпійскі чэмпіёнскі квартэт байдаркі ў складзе **Раман Пятрушэнка**, **Вадзім Махнеў**, **Артур Ліцвінчук** і **Аляксей Абалмасаў** на гэты раз дасягнуў бронзы. Яшчэ адно трэцяе месца ў братоў Багдановічаў у кароткім спрынце канаістаў на 200 м. Мужчынская зборная па настольным тэнісе на чэмпіянаце свету ў Маскве здолела выйсці ў васьмёрку мацнейшых: у 1/8-й беларусы выйгралі ў Польшчы — 3:0, а ў чвэрцьфінале трапілі на „монстраў"-кітайцаў. Выніковае месца Самсонава і кампаніі — 7-е. Беларускі заваявалі 5 узнагарод на міжнародным турніры з серыі Гран-пры па вольнай барацьбе, што прайшоў у Нямеччыне ў горадзе Дармагене. А каманда дзяўчат па стральбе з лука стала другой на этапе Кубка свету ў Харватыі.

Далей па традыцыі прадстаўляем лепшых майстроў індывідуалаў.

1. Юрый Шаюноў (кіданне молата) з вынікам 76 м 80 см выйграў міжнародны турнір у Японіі. Там жа на наступным спаборы ён стаў другім — 77 м 95 см.

2. Сяргей Крывец (футбол) фактычна вырашыў зыход чэмпіянату Польшчы. У перадапошнім туры ён забіў гол за свой клуб — познаньскі „Лех", які стаўся на вагу золата.

3. Яўген Бядулін (дзюдо) узяў золата ў катэгорыі да 100 кг на турніры Гран-пры ў Тунісе.

4. Сяргей Ляховіч (бокс) накаўтам перамог у рэйтынгавым баі Эванса Куіна з Нікарагуі. Паядынак, які праходзіў у нямецкім Ростаку, завяршыўся датэрмінова ў 9-м раўндзе.

5. Аляксей Калюжны (хакей) стаў лепшым сярод беларусаў на чэмпіянаце свету — 4 галы плюс 2 пасы.

1. Надзея Астапчук (штурханне ядра) у кітайскім Шанхаі выйграла этап т.зв. Дыяментавай лігі з лепшым вынікам сезона ў свеце — 20 м 70 см.

2. Дар'я Пчэльнік (кіданне молата) выйграла два турніры з серыі Гран-пры ў Бразіліі. Прытым гарадзенка перамагла ў горадзе Белен з другім вынікам сезона ў свеце — 75 м 42 см. Плюс бронза этапу ў чэшскай Астраве.

3. Ганна Бяляева (вольная барацьба) узяла золата ў катэгорыі да 63 кг на турніры Гран-пры.

4. Алена Кузняцова (стральба з лука) на першым этапе Кубка свету здабыла два сярэбраныя медалі — у індывідуальным заліку і ў камандавым спаборы.

5-6. Ганна Рабцава, Меліта Станюта (мастацкая гімнастыка). Адна на этапе ў Францыі стала 3-й у шматбор'і, а таксама выйграла серабро з мячом, другая на аналагічным спаборы ў Мінску ўзяла „вялікую" бронзу і дзве „маленькія" (з абручом і скакалкай).

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Царкоўны шлюб абаронцы „Ягелоніі”!

(гак)

Гэты шлюб радаваў вочы не толькі з-за знешняй прыгажосці маладажонаў. На гарадскія вяселлі, якія ладзяць у наш час па пятніцах, звычайна з'язджаюцца запрошаныя сваякі. Нават няма каму абгаварыць тых дружбантаў, якія не ў змозе трымаць карону над галовамі маладых у час шлюбу! А тут паглядзець на вяселле прыйшлі звычайныя людзі з парафіі і процьма журналістаў. Ды было на што паглядзець і парадаваць вочы. 28 мая г.г., у беластоцкай Свята-Духаўскай царкве (што ў квартале Антанюк) павянчаліся Ігар Ляўчук з Ізабелай Шчапаньскай. Малады — вядомая асоба ў рэгіёне. 25-гадовы Ігар Ляўчук — абаронца футбольнай каманды „Ягелонія” Беласток. Калі царкоўны хор праспяваў маладажонам *Многае лета*, павянчаная парачка выйшла на царкоўны пляц і выпусціла ў неба два белыя галубкі. У гэты дзень надвор'е спрыяла і два галубкі шчаслі-ва кружылі на фоне блакітнага неба. Стойку таксама пачаставалі вясельным караваем.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Падляшская акадэмія святкавала таксама па-беларуску

Адам БОБРЫК

Падляшская акадэмія ў Седльцах 19 мая адзначыла сваё свята. Была гэта зручная нагода для падвядзення вынікаў працы. Як сказаў рэктар праф. Антоні Юўка, мінулы год быў для вучэльні пераломным. Атрыманне ўжо шостых паўнамоцтваў для прысвойвання навуковай ступені доктара дало магчымасць хадайнічаць за пераўтварэнне Акадэміі ў Прыродна-гуманітарны ўніверсітэт. Цяпер вядуцца ўжо адпаведныя юрыдычныя працэдуры. Павышэнне статусу вучэльні было б таксама павышэннем як для навуковага асяроддзя, так і рэгіёна. Цяпер Акадэмія з'яўляецца навуковай установай, якая рыхтуе кадры перш за ўсё

на патрэбы Падляшша і Мазоўша. Дыпломы гэтай вучэльні атрымала больш за 38 тысяч чалавек. А вучыцца ў ёй амаль 11 тысяч студэнтаў. Паводле рэктара, Падляшская акадэмія гэта не толькі важны дыдактычны, але і навуковы цэнтр. Вядзе яна шматлікія даследаванні і актыўна супрацоўнічае з замежнымі навуковымі ўстановамі.

Доказам рангу ўрачыстасці была прысутнасць на святкаваннях дэлегацый з Беларусі, Расіі, Украіны і ЗША. Сярод іх былі прадстаўнікі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы на чале з праф. Віктарам Таранцеем і Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аляксандра Пушкіна на чале з праф. Аннай Сендзер. Свята Падляшскай акадэміі ўдастоіў таксама пасол Рэспублікі Беларусь у Варшаве праф. Віктар Гайсёнак (на здымку). Выступіў ён на беларускай мове, адзначаючы, што ён упэўнены, што гэтая мова на Падляшшы ўкаранелая і ўсім зразумелая. Сцвердзіў ён, між іншым: „У мяне здаўна ёсць шанс наглядаць за працай Падляшскай акадэміі, магчымасць ацэньваць вашае развіццё. Лічу, што дасягнулі вы вельмі многа як у сферы дыдактыкі ды навукі, так і выхавання. Мяне асабліва цешыць харошае супрацоўніцтва з акадэмічным асяроддзем Беларусі. Для нас садзеянне між нашымі краінамі — гэта прыярытэтная справа. Я ганаруся нашым супрацоўніцтвам”. Пасол падзякаваў таксама за суарганізацыю ў мінулым годзе Эканамічнага форуму. Заявіў таксама, што ўсялякія дзеянні ў карысць збліжэння Беларусі і Польшчы будуць карыстацца падтрымкай пасольства. Пажадаў ён, так як і іншыя госці, каб праз год святкаванне праводзілася ўжо ў мурах універсітэта.

Перавалока

Пётр БАЙКО

Перавалока — гэта рака, якая працякае на тэрыторыі беларускай часткі Белавежскай пушчы. Паводле вуснага пераказу — даўней на рацэ адбывалася гандлёвая камунікацыя. З гэтым і звязана ўзнікненне назвы ракі. Перавалока (рускае — волок, харвацкае — prevlaka, польскае — przewłoka) — гэта месца, якое знаходзіцца паміж двума воднымі басейнамі (рэкамі, азёрамі), па якім працягвалі або перавозілі на вазах лодкі. Гэтая сістэма была даволі распаўсюджана на Русі. Дарэчы, ёсць і іншыя тлумачэнні слова „перавалока”, м.інш. укрытая пад паверхняй вады загарода ў выглядзе ўбітых у дно калоў, якія стваралі перашкоду для лодак.

Рака Перавалока з'яўляецца левым прытокам Лясной Правай (басейн Буга). На адрэзку некалькіх кіламетраў плыве ўздоўж дзяржаўнай граніцы. Рака спалучана штучным вадасховішчам і каналам з ракой Саломенкай (некаторыя лічаць Саломенку верхнім цячэннем Перавалокі). У сваю чаргу Саломенка спалучана вадасховішчам і каналам з ракой Перароўніцай. Правым прытокам Перавалокі з'яўляецца Яменка. Даліна Перавалокі адзначаецца вельмі слаба.

Даўжыня Перавалокі дасягае 24 км (разам з Саломенкай каля 30 км). Басейн ракі ахоплівае паверхню 155 кв. км. Рэчышча даволі звілістае — яго шырыня вагаецца ад 3 да 6 метраў, глыбіня ад 1,2 да 1,3 метраў. Пераплыў вады ў рацэ саставляе 0,015 кубаметра ў секунду.

На рацэ знаходзяцца два вялікія вадасховішчы. Першы (паверхня 230 га) быў збудаваны ў 1963-1964 гадах, другі (каля 70 га) у 1978 годзе. Першае вадасховішча рэканструявалася ў 1984 годзе і ў 2006-2007 гадах, сёння яго паверхня дасяга 260,4 га (шырыня — 1,5 км, даўжыня — 3,5 км). Да часу рэканструкцыі вадасховішча называлася Лядскае або Вялікае Лядскае, зараз — Белавежская пушча. Сёння з'яўляецца яно найбуйнейшым вадасховішчам на тэрыторыі беларускай часткі Белавежскай пушчы.

Рака Перавалока даволі часта згадваецца ў старэйшых дакументах і распрацоўках — пра яе ўспамінаецца, як аб „рацэ ў Сталповіцкай стражы”. Перавалока памечана таксама на карце пушчы з 1784 года, вычарчанай каралеўскім землямерам Міхалам Палхоўскім.

Перавалока з Саломенкай многім асацыюецца з рэінтрадукцыяй бабра ў Белавежскую пушчу. У пачатку кастрычніка 1940 года на Саломенцы быў выпушчаны бабёр, якога прывезлі сюды з Віленшчыны. Яго назіралі тут яшчэ ўлетку 1944 года. У 1956 годзе баброў прывезлі з Варонежскага запаведніка і выпусцілі іх у беларускай частцы пушчы. У 1974 годзе бабровыя збудаванні назіраліся ўжо м.інш. і на рацэ Перавалоцы.

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Бернарда Шоў.

1. паслядоўны рад гукаў у межах адной актавы = 16 _ 19 _ 34 _ 4 _;
2. побач прозвішча = 28 _ 3 _ 8 _;
3. штраф за невыкананне абавязацельстваў = 23 _ 31 _ 30 _ 22 _;
4. між паловай і чвэрцю = 18 _ 24 _ 17 _ 37 _ 38 _;
5. вялікая палка, шост = 20 _ 21 _ 12 _ 13 _ 14 _ 10 _;
6. паклажа на спіне жывёлы = 33 _ 36 _ 27 _;
7. невялікая рухавая рыба = 2 _ 5 _ 11 _;
8. перамяшчэнне пяшком = 29 _ 25 _ 1 _ 35 _;
9. гмінная мясцовасць між Орляй і Нарвай = 6 _ 7 _ 9 _ 15 _;
10. таксіна = 26 _ 32 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.



Адказ на адгаданку з 18 нумара

Дызайн, лук, Мележ, сезон, цаца, шок.

Рашэнне: **Выканаўца ідалаў не будзе ідалапаклоннікам.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Успаміны членаў калектыву „Цаглінкі” пра Канстанціна Майсеню

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Было гэта ў 1975 годзе, калі на пасаду дырэктара Керамічнага прадпрыемства ў Старым Ляўкове прыйшоў Канстанцін Майсеня. Ён добра ведаў, што для поўнамаштабнага развіцця завода патрэбныя не толькі кваліфікаваныя кадры ды высокія вытворчыя паказчыкі, але і адпаведныя сацыяльна-культурныя ўмовы для работнікаў. Таму шмат працы і энергіі прысвяціў ён заснаванню заводскага хору. Дырэктар быў упэўнены, што ў рабочым калектыве з 300 чалавек тоіцца наш вялікі скарб — здольныя спявачкі і спевакі ўлюбёныя ў родную песню.

Ірэна Лапінская ад імя калектыву „Цаглінкі” віншуе Канстанціна Майсеню з 80-годдзем — Гайнаўка, 15.08.2003 г.

Дырэктар Канстанцін Майсеня сарганізаваў хор, натхніў яго жыццём, прыдбаў ім густоўныя сцэнічныя ўборы. Апрача таго, што было для самадзейнікаў нечаканасцю, запрапанаваў, каб харыстамі займаўся прафесіянальны музыкант. Такім чынам у 1976 г. мастацкім кіраўніком хору стаў спецыяліст з музычнай адукацыяй Аляксандр Лукашук. З таго часу 15 харыстаў пачалі двайное жыццё: ўдзень працавалі ў вытворчым цэху, а вечарам збіраліся ў святліцы на рэпетыцыі. У тадышнім хоры спявалі: Ніна Карпюк, Крыстына Віснеўская, Вера Сват, Галена Целушэцкая, Яніна Закшэўская, Ян Рэент, Вера Сухадола, Ірэна Мірановіч, Люба Зялінская, Юры Равінскі, Аляксандр Бандарук, Лявонцій Стасевіч, Ніна Сікорская, Марыя Немяровіч, Феафанія Боцян.

Пры вялікай падтрымцы Канстанціна Майсені былі пераадолены першапачатковыя складанасці і хор стаў дасканаліць свой мастацкі ўзровень, прымаць новых аматараў спеву, так што неўзабаве налічваў ужо 30 чалавек. Дырэктар заахвочваў пашыраць рэпертуар, бо тады, лічыў, будзе магчымасць паказацца шырэйшай публіцы, выступіць на сцэне. Быў ён частым госцем у святліцы і гадзінамі з хваляваннем прыслухоўваўся рэпетыцыям сваіх харыстаў. Ён быў упэўнены, што ляўкоўскі хор атрымае вядомасць далёка па-за сваім асяроддзем.

Першае выступленне адбылося пасля месяца рэпетыцый. Гэта быў канцэрт на ёлачнай імпрэзе ў школе ў Лешуках. Затым выступілі 31 красавіка 1977 г. у Нараўцы на ўрачыстасці з нагоды 1 Мая.

Канстанцін Майсеня ганарыўся, што хору прысвоілі назву „Цаглінкі”, сугучную Керамічнаму прадпрыемству. Хутка яны заваявалі заслужаную папулярнасць у народзе. Іх выступленні можна было пачуць па радыё, пабачыць па тэлебачанні, аглядаць на пляцоўках, у дамах культуры — усюды. Простыя і лёгказапамінальныя мелодыі іх песень услаўлялі адраджэнне і прыгажосць беларускіх фальклорных песень, падкуплялі публіку сваімі народнымі шырокаспеўнымі інтанацыямі. На працягу свайго існавання чарговымі мастацкімі кіраўнікамі хору былі Васіль Целушэцкі і Валянціна Грыка, а з 1991 г. з'яўляецца ім Мікалай Мяжэнны, вядомы спецыяліст з Гродна. А вось яго ўспамін пра Канстанціна Майсеню:

— Я з Майсенем пазнаёміўся ў 1994 г., калі прыехаў з канцэртам у Гайнаўку. На нашым выступленні прысутнічаў спадар Майсеня. Ён тады ўзначальваў Грамадскі камітэт будовы Беларускага музея ў Гайнаўцы. Пасля канцэрта ён падышоў да мяне, адрэкамендаваўся і падзякаваў за выступленне і за тое, што расслаўляем яго родную „Кераміку”. Ён пацікавіўся маёй працай, магчымымі цяжкасцямі з наведваннем Польшчы. Я паскардзіўся, што мне даводзіцца доўга стаяць у чарзе на мяжы. Ён абяцаў дапамагчы, пасля чаго кудысьці патэлефанаваў і дамовіўся, каб мяне прапусцілі без чаргі. А пасля Канстанцін Майсеня часта бываў у Гродне па пытаннях звязаных у будовай музея. Мы некалькі разоў сустракаліся ў Фондзе культуры і размаўлялі аб беларускіх справах. Канстанцін Майсеня заўсёды падкрэсліваў велізарнае значэнне рэалізацыі праекта па будове музея, паколькі ён выступаў за больш цеснае супрацоўніцтва і ўмацаванне сувязей паміж этнічнымі беларусамі Падляшша з гістарычнай Радзімай. У гэтым ён разлічваў атрымаць падтрымку ў адміністрацыі Гродзенскай вобласці, сельскагаспадарчых і прамысловых прадпрыемстваў рэгіёна. Наколькі мне вядома, улады Гродзеншчыны і кіраўніцтва найбуйнейшых гаспадарак з цеплынёй і ўвагай паставіліся да просьбы па аказанні дапамогі пры будаўніцтве музея. Гаспадаркі Гродзенскай вобласці, такія як „Кастрычнік”, „Верцялішкі” і іншыя, бязвыплатна перадалі будаўнічыя і аддзелачныя матэрыялы, сродкі сантэхнікі і ацяплення. Пры падтрымцы Гродзенскай абласной бібліятэкі, а таксама шэрагу раённых бібліятэк быў сфарміраваны бібліятэчны фонд музея. На сродкі Абласнога прадпрыемства кіновідэатэхнікі была цалкам абсталявана кіназала. Наколькі мне вядома, вызначальную ролю падчас стварэння музея адыгралі Таварыства „Радзіма” з Мінска і шэраг гаспадарак Мінскай і Брэсцкай абласцей. Канстанцін Майсеня выклікаў у мяне ўражанне глыбокапрыстойнага, сумленнага і адкрытага чалавека. Быў уважлівым да людзей і іх патрэб, заўсёды імкнуўся падтрымаць і дапамагчы ім. Ён шчыра падтрымліваў развіццё двухбаковых адносін, у першую чаргу ў сферы культуры.

Канстанцін Майсеня гаварыў: песня людская адбівае ў сабе душу чалавека, яго боль і гора, яго патрэбы, жаданні, жыццё. Як па абліччы пазнаюць чалавека, так па песні, асабліва народнай, пазнаецца цэлая нацыя, яе характар і душа. Разам з тым песня многа прыносіла і прыносіць карысці для народа, яна быццам змякчае людскія няшчасці, пацяшае ў нядолі, а калі трэба дык і развесяляе. Усім вядома, што песня — гэта быццам нейкая вялікая таемная сіла. Яна памагала будзіць народ, заахвочваць яго да працы, падымаць з цемнаты, клікаць да святла — навукі, на добрыя, важныя справы.

„Цаглінкі” на працягу свайго існавання, 34-гадовай дзейнасці, далі звыш 500 выступленняў, а можа значна і больш, на розных мерапрыемствах. Выступалі амаль па ўсёй Польшчы, пабывалі ў замежжы — Беларусь, Украіна і інш. А Падляшскае ваяводства аб'ехалі кругом.

Сёння калектыў „Цаглінкі”, якім кіруе Мікалай Мяжэнны, складаюць: Галена Барташук, Люцына Максімюк, Ірэна Лапінская, Юлія Драўноўская, Тадэвуш Вішнеўскі, Анна Зубрыцкая, Ірэна Осяк, Моніка Сухадола, Міраслава Сухадола, Кацярына Кот, Уршуля Сухадола, Марыюш Сухадола, Юры Карпюк і Юры Равінскі.

Канстанцін Майсеня апошні раз сустрэўся з „Цаглінкамі”, будучы ўжо зняможаным сваёй хваробай. Гэтая сустрэча адбылася ў зале Беларуская музея ў Гайнаўцы 15 жніўня 2003 года, калі адзначалі ягоны 80-гадовы юбілей. „Цаглінкі” падрыхтавалі юбіляру канцэрт, завершаны песняй „Многая лета”, якую публіка выслухала стоячы. Падаравалі яны вялікі букет жывых кветак з пажаданнямі ўсяго найлепшага, а перш за ўсё здароўя. Юбіляр падзякаваў і дадаў: „«Цаглінкі» спяваюць — настрой і здароўе ў мяне ўзнімаюць...”.

Калі я распытваў пра Канстанціна Майсеню былых і цяперашніх харыстаў, кожны стараўся дадаць пэўныя рысы да яго вобразу. У кожным выказванні адчуваліся словы ўдзячнасці для слаўнага дзеяча беларускай справы.

06.06 — 12.06

(22.03. — 20.04.) Ужо з 6.06. Юпітэр нясе шчасце і поспехі. Новыя магчымасці, прыліў грошай, удачы ў інтарэсах — у справах вялікіх і дробных. Зробіш усё што заплануеш, ды ўсе гэта ўбачаць! У каханні ўдачы, калі будзе супрацоўніцтва з партнёрам. Многа сілы і ўпартасці.

(21.04. — 21.05.) Бурліва і шмат падзей; не разгубіся. Вырашэнняў не адменіш, ды часам варта не ўпірацца на сваім. З 10.06. ты здольны да вялікага высілку. Накіруеш справы ў адпаведны бок. Мілая атмасфера на працы.

(22.05. — 22.06.) 6-10.06. — адпаведны момант на вырашанне маёмасных і юрыдычных праблем. 8-12.06. — лёгкасць у наладжванні кантактаў, харошыя сяброўствы; людзі, з якімі пазнаёмішся цяпер, прыўкрасяць тваё жыццё. Вялікая кемлівасць (10-25.06.). Твой знаёмы павядзе сябе зусім не ў сваім стылі.

(23.06. — 23.07.) З 9.06. знакаміта ўдадуцца адносіны з іншымі. Пазнаёмішся з вельмі цікавымі людзьмі. Дома мусіш наламаць сабе галаву, каб усё ішло як у гадзінніку. Калі будучыня не явіцца ясна, дык адчакай. Увядзі ў жыццё больш гармоніі.

(24.07. — 23.08.) Спакойная першая палова месяца. Калі штосьці разлучыла цябе з мілай асобай, прыйшоў час паяднацца. Ва ўражанні, якое выкліча асоба, з якой ты пазнаёмішся, не памылішся. З'ездзі кудысьці, асабліва са Стральцом ці Блізнюком. Падумай больш пра сябе; можаш трапна заінвеставаць у свой выгляд!

(24.08. — 23.09.) 7.06. усё пойдзе ўперад. Станеш незалежным, адкрытым на новыя ідэі, адважна выкажаш свае погляды. 8-12.06. — ідэальны час на афармлянне судовых, юрыдычных, прафесійных і фінансавых спраў.

(24.09. — 23.10.) З 10.06. (да 14.06.) знакамітыя лады з кіраўніцтвам. Дзякуючы адабрэнню і падтрымцы начальства адчуеш сябе як у сям'і. Калі ты ў чаканні пачуцця — сустрэнеш яго якраз цяпер; вырастуць табе крылы! Грошы (амаль увесь месяц) хутчэй збіраеш, чым расходуеш.

(24.10. — 22.11.) З 11.06. (да 15.06.) пераможаш усе перашкоды і здзейсніш проста немагчымае! Стаў перад сабою як найбольш амбіцыйныя мэты. З 9.06. ведзены інстынктам звычыш абсалютна адпаведную асобу. Больш увагі прысвяці сям'і. Не засяроджвайся на тым што мінула, смела глядзі ў будучыню. Мабілізацыя на працы; патрэбныя адвага і рашучасць.

(23.11. — 22.12.) Набярэш імпэту з 6.06. Урэшце рушыш уперад! Цяжкія справы вырашацца, мабыць, дзякуючы ўмяшанню кагосьці звонку. 8-12.06. — дзякуючы твайму імкненню да ведаў і вялікім здольнасцям прыкмеціць цябе кіраўніцтва. Месяц без рэвалюцыйных змен, затое поўны спакою і ўдач. З поспехам (хоць не маланкавым) пасядзі да дыеце.

(23.12. — 20.01.) 9.06. усвядоміш, што ў тваёй пары сапраўды важнае. А колькі ўсяго будзе тварыцца! Прынясе гэта нервовасць, ды дадасць табе творчых сіл. Дома рыхтуюцца важныя змены; будзе гэта патрабаваць тваёй увагі. 6-10.06. — дзякуючы адпаведнай стратэгіі ўдасца табе правесці шмат спраў. Каханне жыцця чакай паміж 10 і 14.06. Не ўблытайся ў канфлікт з асобай, якая мае ўладу.

(21.01. — 19.02.) 8-12.06. — гарантаваныя геніяльныя ідэі. Час незвычайных сустрэч, калі можаш заваражыць тых, хто табе даспадобы. Узрасце тэмпература пачуццяў. Не шкадуй часу на імпрэзы з сябрамі. З 10.06. (да 20.06.) можаш мець праблемы з дастасаваннем да атачэння.

(20.02. — 21.03.) 7-11.06. з нявінных плётак можа вырасці грубая афёра; не адкрывайся лішне перад неадпаведнымі асобамі. Не давярай кожнаму! Настрой паправіцца. У пары дробныя праблемы. Шчасце спрыяе ў фінансах і бізнесе.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960